№2(48)/2003

Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, люты-сакавік, 2003 г.

# ТРЭБА ЛЮБІЦЬ НАРОД



Фота А. Каляды

## ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

### *САКАВІК* *(2002 г., працяг з №1(47)*

*23 сакавіка.* У Горадні ў несанкцыянаваным мітынгу прынялі ўдзел каля 500 чалавек. Затрыманыя 22 чалавекі. ***Вадзім Саранчукоў*** пры затрыманьні быў зьбіты. Удзельнікі акцыі сьведчаць: міліцыянты зьбівалі яшчэ пяцёх маладых хлопцаў, але не навідавоку, а ў завулку. Білі нагамі.

Сярод затрыманых таксама ***Віктар Сазонаў***, ***Яўген Лугін***, ***Эдвард Дзьмухоўскі***, ***Сяргей Мальчык***, ***Міхаіл Патрэба***, ***Мікола Гом***, ***Алег Завадзкі***, ***Ігар Лапеха***, ***Алена Сідлярэвіч***, ***Дзьмітры Іваноўскі***, ***Сьвятлана Нех***, ***Рэгіна Станкутэ***, ***Андрэй Шустоўскі***, ***Андрэй Пачобут***, ***Яўген Шабунька***, ***Аляксей Кучар***, ***Раман Рамашка***, ***Мікола Лемяноўскі*** (абвінавачваецца ў арганізацыі акцыі).

У Менску і Горадні міліцыянты (АМАП) асабліва жорстка зьбівалі людзей. Акцыі ў іншых гарадах (Віцебску, Магілёве, Берасьці, Асіповічах, Слоніме і інш.) прайшлі больш спакойна.

*25 сакавіка* адбыліся яшчэ акцыі ў Пінску і Смалявічах. Адмысловыя ўлёткі да Дня нацыянальнага сьвята падрыхтавала Гомельская суполка Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. У іх зьмешчаны беларускі каляндар з указаньнем памятных датаў, выява *Пагоні* і верш ***Рыгора Барадуліна***.

*25 сакавіка ў Маладэчне* супрацоўнікі міліцыі затрымалі ***Эдуарда Баланчука***, ***Алеся Капуцкага***, ***Сяргея Боскіна*** падчас адзначэньня сьвята Дня Незалежнасьці (ускладаньня кветак да помніка ***М.К. Агінскага***, а таксама да памятнага знаку *„Пакутнікам за волю і незалежнасьць Беларусі")*. Гэтаму перашкаджалі супрацоўнікі міліцыі пад кіраўніцтвам маёра, які не назваўся, і старэйшага лейтэнанта **Кошаля**. (У сьвяточным мерапрыемстве ўдзельнічала каля 100 чалавек).

*25 сакавіка на Меншчыне* (акрамя Маладэчна) Дзень Незалежнасьці адзначаўся ў Барысаве, Вялейцы і Мар'інай Горцы. Тут ноччу на будынках па цэнтральных вуліцах было агульна вывешана 40 *Бел-Чырвона-Белых сьцягоў.*

*25 сакавіка* пачаліся суды над удзельнікамі акцый на Дзень Незалежнасьці, затрыманымі лукашэнкаўскай міліцэйшчынай 24 сакавіка. У Цэнтральны раённы суд сталіцы прывезьлі 24 арыштаваных. Павінны былі прывезьці ***Зьмітра Карпенку***. Але напярэдадні яго моцна зьбіў камандзір „амону" падпалкоўнік **Падабед**. Юнака адвезьлі ў 4-ы клінічны шпіталь з страсеньнем мазгоў.

Судзілі **Натальля Вайцяховіч** і **Тацьцяна Паўлючук**: штрафавалі, папярэджвалі і арыштоўвалі затрыманых.

***Сяргей Трыфанаў*** — малады лекар Гомельскага Абласнога псіхіятрычнага

шпіталю, вучыцца на курсах павышэньня кваліфікацыі. На судзе ён сказаў: „Я прышоў на мерапрыемства сьвядома, і ўдзельнічаў сьвядома… Я скарыстаўся сваім канстытуцыйным правам – выявіць сваю палітычную волю. Ніякіх беспарадкаў я не чыніў, нікога не зьневажаў”. Аштрафаваны на 20 мінімальных заробкаў.

Вынесеныя прысуды: ***Зьміцеру Дашкевічу*** і ***Віктару Кавешнікаву*** — адміністрацыйны арышт на 10 сутак; ***Вячаслаў Сіўчык*** – 15 сутак арышту; ***Аляксей Смольскі, Дзьмітры Таруліс, Валеры Герасімаў, Лявон Садоўскі: Пятро Русаў*** — штраф 20 мінімальных заробкаў; ***Сяргей Трыфанаў, Андрэй Лаховіч, Аляксандар Шавеленка, Мікола Лавіцкі, Андрэй Талстыка, Сяргей Бязьдзенежны*** – папярэджаньне.

*26 сакавіка* суддзя Цэнтральнага раёну Менска **Вайцяховіч** прызнала ***Паўла Севярынца*** вінаватым у „арганізацыі несанкцыянаванага шэсьця” і прысудзіла яму 15 сутак арышту.

*26 сакавіка У Горадні* атрымалі папярэджаньні ***Міхаіл Патрэба*** і ***Раман Рамашка***. ***Вадзім Саранчукоў*** атрымаў 10 сутак арышту. Яго судзілі завочна. Прысудзілі штрафы ***Міколу Лемяноўскаму*** *(1 мільён 500 тыс, рублёў)*, ***Віктару Сазонаву*** *(200 тысячаў)*, ***Сьвятлане Нех*** *(500 тысячаў)*. ***Максіму Лебедзеву*** – папярэджаньне.

*27 сакавіка* ў судзе г. Рэчыца (Гомельская вобласьць) павінен быў адбыцца судовы разгляд крымінальнай справы ***Натальлі Брэль*** (па арт. 367 ч.1 КК – паклёп на „прэзыдэнта”). Абвінавачаная ў чарговы раз не зьявілася на судовае паседжаньне. Зьявілася інфармацыя, што яна знаходзіцца ў Бэльгіі, дзе папрасіла палітычнага прытулку.

*29 сакавіка. Менск.* Суд Цэнтральнага раёна вынес папярэджаньне ***Эдварду Зайкоўскаму.***

*Сакавік.* Горадзенскі выканаўчы камітэт адмовіў грамадзкасьці Горадні ў правядзеньні трох пікетаў у абарону галоўнага рэдактара *„Пагоні”* ***Міколы Маркевіча*** і журналіста ***Паўла Мажэйкі***, якіх пракуратура вобласьці абвінавачвае ў паклёпе на „прэзыдэнта”.

*31 сакавіка. Горадня.* Суд над журналістамі забароненай уладамі горадзенскай газэты *„Пагоня”* ***Міколам Маркевічам*** і ***Паўлам Мажэйкам*** прызначаны на 9 красавіка. Журналісты абвінавачваюцца ў паклёпе на „прэзыдэнта” (арт.367, ч.2 КК), што караецца пазбаўленьнем або абмежаваньнем волі на тэрмін да 5-ці гадоў.

*Сакавік.* За год (з 2000 па 2001-шы) рэнтабельнасьць сельскагаспадарчай вытворчасьці ў Беларусі зьнізілася у **31** раз (з **6,2%** да **0,2%**). Доля стратных прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы ўзрасла за год у 1,3 разы (з **41,8%** да **54,2%**).

Гэта вельмі небясьпечны „акупацыйна-эканамічны” працэс. Беларускую вёску разбураюць, кладуць на лапаткі, каб потым лёгка б было задарма адабраць ад беларусаў зямлю.

*Сакавік.* Звальняюць вучоных. У Інстытуце гісторыі АН Беларусі працягваюцца скарачэньні. Годам раней пазвальнялі тых, хто працаваў на паўстаўкі. Цяпер скарачаюць лябарантаў, а астатнія навуковыя супрацоўнікі пішуць справаздачы. У каго будзе горшы паказьнік – могуць звольніць. Плянуецца скараціць 15 адсоткаў супрацоўнікаў. Скарачэньні плянуюцца таксама ў ВНУ.

*Сакавік.* Русіфікацыя радыё. У беларускамоўных перадачах першай праграмы Беларускага радыё вядучыя зьвяртаюцца да сваіх суразмоўцаў на рускай мове, чым адразу ж правакуюць іх адказваць па-руску.

*Сакавік.* Русіфікацыя — „008”. Служба дакладнага часу па тэлефоне „008” з сакавіка перайшла зь беларускай мовы на расейскую.

## *КРАСАВІК (2002 г.)*

*1 красавіка. Горадня.* Каля будынку Аблвыканкаму адбыўся несанкцыянаваны пікет у абарону ***Міколы Маркевіча*** і ***Паўла Мажэйкі***. На прапановы міліцыянтаў разыйсьціся пікетоўцы не рэагавалі. Праз дваццаць хвілінаў шасьцёра ўдзельнікаў пікету (***Дзьмітры Антаневіч, Дзьмітры Дулько, Стась Пачобут, Павел Мутны, Алесь Дзянісаў, Ільля Пячынін***) былі затрыманыя міліцыяй.

*2 красавіка. Горадня.* Каля будынка Горадзенскага Аблвыканкама восем горадзенцаў правялі несанкцыянаваны пікет у абарону ***Міколы Маркевіча*** і ***Паўла Мажэйкі***. Праз дваццаць хвілінаў шасьцярых удзельнікаў пікета затрымала міліцыя. Над затрыманымі прызначаны суд.

*2 красавіка ў Барысаве* позна ўвечары быў затрыманы пры расклейцы налепак ***Алесь Моніч***. У пастарунку на яго быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні.

*3 красавіка* суд Цэнтральнага раёна Менска вынес прысуд удзельніку сьвяткаваньня сёлетнега Дня Незалежнасьці сябру *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* спадару ***Андрэю Ачапоўскаму*** – штраф у памеры 1,5 мільёнаў рублёў. Лукашэнкаўская відушчая Фэміда жорстка пакарала дзесяткі беларускіх патрыётаў за сьвяткаваньне нацыянальнага сьвята. Рэжым працягвае тым часам інтэграцыйныя гульні з Расеяй.

*3 красавіка. Менск, мікрараён „Паўднёвы Захад”.* Трох п’яных міліцыянтаў накінуліся (як выглядала, без прычыны) на некалькіх інтэлігентных людзей, што стаялі на прыпынку тралейбуса. Міліцыянты пачалі іх біць і нават нацкавалі службовага сабаку (які пачаў грызьці аднаго за нагу). Аднак за людзей уступіліся іншыя людзі, што стаялі на прыпынку, і надавалі міліцыянтам кухталёў.

Тыя ў сваю чаргу выклікалі па рацыі падмацаваньне. Прыехаў аўтобус і шэсьць міліцэйскіх машын, зь якіх выскачыла 50 салдатаў АМАПу. Тады ўзбунтавалася ўся грамада людзей, што стаяла на прыпынку і кінулася лупіць амапаўцаў. Пры гэтым разагналі іх і хацелі перавярнуць аўтобус, на якім тыя прыехалі. Тады зьявілася высокае міліцэйскае начальства, забралі п’яных міліцыянтаў і паабяцалі, што пакараюць сваіх супрацоўнікаў. На гэтым і скончылася.

Зазначым: тое, што людзі ўступіліся за людзей, бачачы несправядлівасьць, — такое магчыма толькі ў Беларусі. На Захадзе такое, практычна, выключаецца. Ніхто нікому не дапамог бы. Маўляў, — „твае праблемы”.

*4 красавіка ў Менску* ўначы быў учынены напад на офіс „Альфарадыё”. Невядомая жанчына разбіла камянямі шыбы і дзьверы офісу, пратараніла сваёй машынай чатыры аўтамабілі, што стаялі на стаянцы, і зьнікла. Міліцыя хутка затрымала тэрарыстку.

*Красавік.* У месцах пазбаўленьня волі ў Беларусі цяпер утрымліваюцца **42** тысячы асуджаных, а выпраўленчыя ўстановы перапоўненыя на 37%. Пра гэта паведаміў на пленуме Вярхоўнага суду Беларусі міністар МУС Навумаў. Паводле статыстыкі МУС, у 1998 г. 16% прысудаў былі вынесеныя ў выглядзе штрафаў, а ў 2001 г. – толькі 4,9%.

*5 красавіка. Горадня.* Адбылася чарговая акцыя пратэсту супраць крымінальнага перасьледу журналістаў *„Пагоні”*. Арганізатары пікетаваньня неаднаразова зьвярталіся ў Гарвыканкам, каб атрымаць адпаведны дазвол. Аднак гарадзкія ўлады не далі магчымасьці грамадзянам рэалізаваць іхныя канстытуцыйныя правы.

Пікеты прайшлі ў людных месцах горада: каля будынка Аблвыканкама і на плошчы Савецкай. Удзельнікі акцыі трымалі ў руках транспаранты: *„Рукі прэч ад Маркевіча і Мажэйкі!”.* Міліцыя затрымала 14 чалавек (пазьней аднаго з 14-ці затрыманых адпусьцілі). Суддзя **Дземчанка** разгледзеў справы астатніх удзельнікаў акцыі і вынес прысуды: ***Андрэй Пісальнік*** *(газэта „Дзень”)* і ***Стась Пачобут*** *(„Навінкі”)* —– 10 сутак арышту; ***Андрэй Мялешка*** *(„Наша Ніва”)* – 8 сутак арышту*;* ***Аляксандар Дварэцкаў*** *(сябра ГА БАЖ)* – 4 сутак арышту; ***Ірына Чарняўка*** *(„Беларускі час”)* – штраф 30 мінімальных заробкаў*;* ***Вітаўт Руднік*** *(рэдактар бюлетэню „Трэці сэктар”)* і ***Зьміцер Ягораў*** *(BARC-news)— па 3-е сутак арышту;* ***Алена Сіневіч*** *(радыё „Рацыя”: Беласток) – штраф 20 мінімальных заробкаў;* ***Вольга Арцёменка*** *(„Біржа інфармацыі”)* і ***Андрэй Пачобут*** *(„Gios znad Niemna”)* – папярэджаньне. Суды над ***Юліяй Дарашкевіч*** і ***Алесяй Сідлярэвіч*** *(„Пагоня”)* перанесеныя.

*Красавік.* Шчучынскі райвыканкам зацьвердзіў новую сацыяльную праграму пад прагматычным тытулам „Аб рацыяналізацыі сеткі ўстановаў адукацыі раёну”. Сутнасьць „праграмы” – закрыцьцё шэрагу беларускіх навучальных установаў і ў першую чаргу – „малакамплектных” школаў у вёсках. У сьпіс на ліквідацыю трапілі Касьцянеўская, Красулёўская, Барташская, Доўгаўская школы і Ражанкаўскі вучэбна-вытворчы камбінат. ***Пагром беларускай сістэмы адукацыі працягваецца.***

*10 красавіка. Баранавічы.* Яшчэ на пачатку 2002 году Баранавіцкая Рада ТБМ зьвярнулася да начальніка гарадзкога Ўпраўленьня адукацыі **Ігната Стасевіча**

зь лістом, у якім прапановалася, каб адна з гімназіяў гораду насіла імя знакамітага вучонага-беларуса *Ігната Дамейкі*, 200-я ўгодкі якога сёлета адзначаюцца ў сьвеце.

Прапанова была абгрунтаваная тым, што жыцьцё *Ігната Дамейкі* цесна зьвязана з Баранавіцкім краем, тут знаходзяцца яго карані па лініі маці. У адказе Упраўленьне адукацыі (які зьмяшчае ў тэксьце 7 памылак) Радзе ТБМ паведамляецца, што „адкрыцьцё ў Баранавічах гімназіі імя Ігната Дамейкі немэтазгодна".

*13 красавіка. Барысаў.* Тут адбыўся стыхійны мітынг пратэсту супраць зносу будынкаў у гістарычнай частцы гораду XIX – XX стагоддзяў. Мітынгоўцы сталі насупраць уваходу на тэрыторыю старабарысаўскага рынку з 10-мэтровым плякатам-расцяжкай: *„Што мы пакінем нашым нашчадкам пасьля сябе?"* Раздаваліся ўлёткі, якія заклікалі барысаўцаў узьняць свой голас супраць зносу гістарычных будынкаў, які вось ужо трэці месяц запар тут ажыцьцяўляюць улады. Зьбіраліся подпісы пад адпаведным патрабаваньнем да кіраўніцтва Гарвыканкаму.

Праз 20 хвілінаў жадаючых падпісаць пратэст ды выказацца з гэтай нагоды назьбіралася некалькі сотняў чалавек.

*19 красавіка.* Напярэдадні Чарнобыльскага Шляху ў Менску адбылася правакацыйная (па ацэнцы Беларускага Вызвольнага Руху) акцыя пад прыцягальнай назвай „Так жыць нельга". „Арганізатары" і заяўляльнікі яе – ужо знаёмыя ў Менску „падвойныя" асобы (З. Бандарэнка, М. Халезін, Ц. Дранчук і інш.). Зьдзіўленьне выклікала толькі прысутнасьць у гэтай кампаніі кінарэжысёра Юры Хашчавацкага. (Таленавітыя асобы часта бываюць вельмі даверлівымі. Магчыма, гэтым можна растлумачыць ягоны ўдзел у кампаніі, якая дрэнна пахла.)

Сутнасьць задумы пад актуальным лёзунгам – перашкодзіць традыцыйнай агульнанацыянальнай акцыі „Чарнобыльскі Шлях". Перабіць увагу і актыўнасьць людзей, зьбіць іх зь беларускага тору, застрашыць (апошняя пазыцыя найбольш гнюсная).

На жаль, гапонаўшчына ўдалася правакатарам. І найбольш па праграме страху. Адбыўся (як і трэба было чакаць) змасаваны напад „спэцназу" і „амапу" на людзей і жорсткае зьбіцьцё дэманстрантаў. Арыштавалі, зьбілі і пакалечылі дзясяткі асобаў – старых, непаўнагадовых, кабет і нават цяжарных жанчынаў.

Малы друк падаў сьпісы (няпоўныя) зьбітых, арыштаваных і засуджаных мірных жыхароў Менска, што выйшлі на шэсьце 19 красавіка.

Сярод арыштаваных: ***Марына Ясюк*** *(непаўнагадовая)*, ***Натальля Радзіна***, ***Зьміцер Арэшка***, ***Юры Васілюк***, ***Яўген Шагееў***, ***Падзывалаў*** *(моцна зьбіты)*, ***Максім Аксёнаў***, ***Кацярына Баравік***, ***Леанід Ачапоўскі***, ***Юрась Васілюк***, ***Сяргей Бохан***, ***І. Дзегцяроў***, ***В. Ідзевіч***, ***А. Грыдзюшка***, ***С. Лядко***, ***В. Яцко***, ***С. Яцко***, ***Ф. Тутжык***, ***Мяцелік***, ***Я. Шумская***, ***А. Холад***, ***Юрась Васкрасенскі***, ***Ялавіцкі*** *(шпіталізаваны з страсеньнем мазгоў)*, ***Ядко*** (зьбітая, страсеньне мазгоў), ***Галавацкі***, ***Осіпаў*** *(шпіталізаваны)*, ***Юрась Варанько***, ***Андрэй Асмалоўскі***, ***Мікола Савіцкі***, ***Алена Рашэтнікава***, ***Казакоў*** *(непаўнагадовы)*, ***Барсукоў*** *(непаўнагадовы)*, ***Балоціна*** *(непаўнагадовая)*, ***Дорына*** *(непаўнагадовая)*, ***Варажур*** *(непаўнагадовы)*, ***Цімох Шадзевіч*** *(непаўнагаадовы)*, ***Васіль Шадзевіч***, ***Аляксей Строцкі*** *(непаўнагадовы)*, ***Мікіта Сасім***, ***Ямшыкоў***, ***Дзяніс Чыкалёў***, ***Лугаўцоў***, ***Ніна Труханенка*** і інш.

*Уначы 20 красавіка* невядомымі быў падпалены намёт *у Курапатах.* У намёце знаходзілася трох маладых людзей. Адзін зь іх, ***Алесь Поклад***, дастаўлены ў шпіталь з моцнымі апёкамі.

*22-23 красавіка, Менск.* У судах Савецкага, Партызанскага і Цэнтральнага раёнаў адбываўся разгляд адміністрацыйных справаў удзельнікаў несанкцыянаванага маршу (19 красавіка). Актыўна „папрацавалі" суддзі **Т. Паўлючук**, **Н. Вайцяховіч**, **Р. Казадаеў**, **А. Рэлява**, **А. Дзёмінская**, **Ю. Лебедзь**. У суды было дастаўлена 43 затрыманых.

Прысуды. Суд Савецкага раёну Менску: ***Юры Хашчавацкі*** *(10 сутак арышту)*, ***Сяргей Пенкін*** *(штраф 300 тыс. рублёў)*, ***Віталь Вядзевіч*** *(7 сутак арышту)*, ***Максім Шыраеў*** *(штраф 250 тыс. рублёў)*, ***Віталь Жлобіч*** *(штраф 250 тыс. рублёў)*, ***Сяргей Кедышка*** *(штраф 300 тыс. рублёў)*, ***Кацярына Дзядко*** *(штраф 300 тыс. рублёў)*, ***Аляксандра Анджыеўская*** *(5 сутак арышту)*, ***Люба Кучынская*** *(суд перанесены)*, ***Георгі Лепін*** *(суд перанесены)*, ***Зьміцер Вішнеўскі*** *(3 сутак арышту)*, ***Лявон Садоўскі*** *(пратакол праваправарушэньня накіраваны ў РУУС на дапрацоўку і перакваліфікацыю з арт. 167-1 ч.1 на арт 167-1 ч.2)*, ***Раман Карповіч*** *(Салігорск; 10 сутак арышту)*, ***Васіль Хадневіч*** *(штраф 200 тыс. рублёў)*, ***Казімір Мурашка*** *(штраф 250 тыс. рублёў)*, ***Зьміцер Бандарэнка*** *(адзін з арганізатараў акцыі; суд перанесены)*, ***Яраслаў Сьцешык*** *(суд перанесены)*, ***Алеся Ясюк*** *(Барысаў; маці 4-х дзяцей; штраф 100 базавых адзінак)*, ***Дзімітры Карпенка*** *(Гомель; 3 сутак арышту)*, ***Мікалай Халезін*** *(адзін з арганізатараў акцыі; суд перанесены)*.

Суд Цэнтральнага раёну Менска: ***Андрэй Пятроў*** *(3 сутак арышту)*, ***Зьміцер Голубеў*** *(5 сутак арышту)*, ***Зьміцер Бародка*** *(Барысаў; 5 сутак арышту)*, ***Яўген Афнагель*** *(3 сутак арышту)*, ***Віктар Суіч*** *(5 сутак арышту)*, ***Уладзіслаў Ігнатовіч*** *(5 сутак арышту)*, ***Васіль Жакаў*** *(суд перанесены)*, ***Зьміцер Масакоўскі*** *(штраф 300 тыс. рублёў)*, ***Аляксандар Радзюшка*** *(5 сутак арышту)*, ***Алег Мяцеліца*** *(5 сутак арышту)*, ***Ігар Сюльд*** *(5 сутак арышту)*, ***Раман Казакевіч*** *(10 сутак арышту)*, ***Алег Жлутка*** *(суд перанесены)*.

Суд Партызанскага раёну Менска: ***Сяргей Рабкевіч*** *(7 сутак арышту)*, ***Юры Фабішэўскі*** *(3 сутак арышту)*, ***Анатоль Аскерка*** *(10 сутак арышту)*, ***Юры Бубер*** *(3 сутак арышту)*, ***Вераніка Купчанка*** *(3 сутак арышту)*, ***Аляксандар Атрошчанкаў*** *(5 сутак арышту)*, ***Аляксей Яшчанка*** *(3 сутак арышту)*, ***Ігар Закрэўскі*** *(3 сутак арышту)*, ***Дзьмітры Цэнунін*** *(3 сутак арышту)*, ***Валеры Шчукін*** *(адзін з арганізатараў акцыі; быў моцна зьбіты падчас акцыі; 15 сутак арышту).*

*Красавік.* Статыстыка. 20% найбольш забясьпечаных сем'яў Беларусі атрымліваюць удвая больш ільгот, чым 20% найменш забясьпечаных сем'яў. Ільготныя пуцёўкі атрымліваюць у асноўным тыя, хто багацейшы. У 2000 г. гэтыя 20% найбольш забясьпечаных сем'яў атрымалі пуцёвак у 4 разы болей, чым 20% найменш забясьпечаных. Тое самае і зь лекамі. Тыя, што багацейшыя, у 2000 г. атрымалі ільготных лекаў у 3,7 разоў болей, чым самыя бедныя сем'і.

*Красавік.* Статыстыка. Праведзеныя Дзяржаўнай інспэкцыяй працы праверкі выявілі ў 2001 г. блізка 320 тысячаў фактаў парушэньня працоўнага заканадаўства. На гэтай падставе была забароненая або прыпыненая праца **86** цэхаў, **710** вытворчых участкаў, больш за **21** тысячу рознага вытворчага абсталяваньня. За парушэньне правілаў працы ў 2001 г. прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасьці **8836** адказных асобаў, прыменены эканамічныя санкцыі да **5828** наймальнікаў, вызвалена ад займаемай пасады **41** асоба, **53** – прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці. ***Ў мінулым годзе на працы загінула 239 працаўнікоў.*** Траўмы з цяжкімі наступствамі атрымала **675** чалаавек.

*Красавік.* Сярэднія школы Беларусі атрымалі цыркуляр, падпісаны міністрам адукацыі **П.Брыгадзіным**. У дакуманце паведамляецца, што з ліку дысцыплінаў, абавязковых пры здачы выпускных іспытаў, ***выключаецца беларуская літаратура***.

„Разабраўшыся" з мовай, прамаскоўскія ўлады намерыліся паставіць крыж і на беларускай літаратуры.

## *Дадатак: СТУДЗЕНЬ* *(2002 год)*

*5 студзеня, Менск.* Узбуджана крымінальная справа ў дачыненьні да дырэктара Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства „Менскі трактарны завод" **Міхаіла Лявонава**. Яму інкрымінуецца ўдзел у злачынствах (арт. 166 ч.2 і 168 КК — злоўжываньне службовым становішчам, якое мела цяжкія наступствы, а таксама нядбальства, якое нанесла шкоду ў асабліва буйных памерах). Дырэктара МТЗ зьмясьцілі ў ізалятар часовага ўтрыманьня.

Перад гэтым за краты трапілі ўжо дырэктар Гомельскага радыёзаводу **Анатоль Кірыкаў**, дырэктар Задняпроўскага рынку ў Магілёве **Анатоль Пратасеня**, начальнік Беларускай чыгункі **Віктар Рахманько**, дырэктар аб'яднаньня „Атлант" і былы спаборнік у прэзыдэнты **Леанід Калугін**, дырэктар стадыёну „Трактар" у Менску **Васіль Алейнікаў**, дырэктар аўтамабільнага рынку „Гандлёвы сьвет — „Кола" **Аляксандар Васілеўскі** і іншыя — усяго каля 500 асобаў.

Гэта новая хваля рэпрэсіяў у асяроддзі рэжымнай кампрадорскай адміністрацыі.

***(Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ; Прэс-служба Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ; рэдакцыя „Б.В.")***

# МАШЫНА ФАЛЬСІФІКАЦЫІ

Беларускае грамадзтва ўжо дастаткова добра інфармаванае і пераканалася ня раз на ўласным вопыце, што прамаскоўскім рэжымам на Беларусі створана адмысловая, цалкам пазбаўленая грамадзкага кантролю машына фальсіфікацыі выбараў, падабраныя да яе і вышкаленыя адпаведныя кадры. Менавіта цераз гэтую акупацыйную машыну фальсіфікацыі рэжым Лукашэнкі адлучыў беларускі народ ад удзелу ў фармаваньні прадстаўнічай улады.

Усё гэта ня раз пацьвердзіла, што пры прамаскоўскім рэжыме выбары ў Беларусі ня могуць быць свабоднымі і дэмакратычнымі, выбраньне дэпутатаў народа, настроеных супраць палітыкі рэжыму, выключаецца. Гэта дае магчымасьць існуючаму рэжыму правесьці праз галасаваньне на выбарах ці рэфэрэндуме любую палітычную авантуру. Прамаскоўскія ўлады на Беларусі цалкам ігнаруюць як меркаваньні беларускага народа (які здольны, на іх думку, бясконца цярпець любую несправядлівасьць і зьдзек), гэтак і думку міжнароднай супольнасьці.

2-га сакавіка гэтага года, у час выбараў у мясцовыя саветы, ***толькі адна траціна выбаршчыкаў прышла на ўчасткі для галасаваньня дабраахвотна***. Гэта пераважна тыя, хто яшчэ верыць абяцаньням рэжыму, тыя, хто адгукнуўся на заклікі кандыдатаў ад вікаўскай „дэмапазыцыі", якія (насуперак лёгіцы і патрабаваньням Беларускага Вызвольнага Руху) прынялі ўдзел у выбарах, і тыя, што былі застрашаныя начальствам, прымушаныя (нават прывезеныя) галасаваць.

Астатнія ***дзьве траціны выбаршчыкаў удзелу ў галасаваньні не прымалі***. Іхная нібыта „яўка" на выбары і „галасаваньне" былі сфальсіфікаваныя машынай фальсіфікацыі. Па Менску, напрыклад, прагаласавала ня больш **35%**. Машына фальсіфікацыі напісала **60%**.

Лічбавыя паказчыкі галасаваньня, абвяўленыя рэжымам, ёсьць вынік масавых маніпуляцыяў з боку ўладных структураў. Падчас выбарчага фарсу (як напярэдадні, гэтак і ў дзень галасаваньня) грамадзяне Беларусі зьведалі на сабе беспрэцэдэнтны ціск чынавенства, мэтаю якога было прымусіць людзей прагаласаваць, каб затым падтасаваць патрэбныя лічбы. Выбарчыя камісіі, фактычна, дзейнічалі як палітычныя ворганы ўлады, і, у абсалютнай большасьці, не дапусьцілі грамадзкага кантролю за сваёй працай.

Уціск быў арганізаваны найперш на жыхароў вёсак і невялікіх гарадоў, супрацоўнікаў бюджэтных прадпрыемстваў і ўстановаў, студэнтаў дзяржаўных ВНУ, якія жывуць у інтэрнатах, а таксама на бацькоў вучнёўскай моладзі. Грамадзянам пагражалі звальненьнем з працы, высяленьнем з інтэрнатаў, выключэньнем з ВНУ. Факты перасьледу жыхароў краіны за нежаданьне ўдзельнічаць у выбарчым фарсе будуць абагуленыя і надрукаваныя.

Бязьмежныя, цынічныя і расьперазаныя парушэньні выбарчага заканадаўства, да якога былі змушаныя выбарчыя камісіі, мелі на мэце прынамсі тры аспэкты выбарчага злачынства:

— фальсіфікацыю галасаваньня;

— праверка і падрыхтоўка кадраў камісіяў для зьдзяйсьненьня беззаконьняў;

— павязваньне членаў камісіяў супольным крыміналам дзеля безадказнага правяденьня і фальсіфікацыі мяркуемага „рэфэрэндуму" па незаконным „канстытуцыйным акце" аб анэксіі Беларусі Расеяй (фармулёўку Лукашэнка з Пуціным прыдумаюць у адпаведнай форме і ў адпаведны час).

„Дэпутаты", уведзеныя незаконным чынам у выніку выбарчых падтасовак у склад мясцовых саветаў, павінны ведаць пра непазьбежнасьць іхняга далейшага ўдзелу ў антызаконнай дзейнасьці рэжыму. Яны фактычна сталі закладнікамі рэжыму.

Беларускі Народны Фронт, ягоная Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ як асноўныя складнікі Беларускага Вызвольнага Руху заяўляюць, што ***выбары ў мясцовыя саветы 2-га сакавіка — сфальсіфікаваныя і ня могуць быць прызнаныя за сапраўдныя***.

Усе выбарчыя камісіі, якія дзейнічалі ў сістэме фальсіфікацыі, зьдзейсьнілі крымінал, масава і груба парушылі заканадаўства. Яны мусяць быць адлучаныя ад выбарчага працэсу і ня могуць надалей праводзіць выбарчыя кампаніі. Парушэньні закона членамі выбарчых камісіяў павінны разглядацца ў судзе.

Мы падкрэсьліваем, што ў абставінах, якія створаныя рэжымам на выбарах у Беларусі, толькі масавы шырокі байкот выбарчых прафанацыяў усім насельніцтвам можа забясьпечыць перамогу народу над узурпатарамі беларускай улады.

Ёсьць мірная пэрспэктыва для Беларусі — гэта новыя выбары прэзыдэнта пад міжнародным пратэктаратам (гэта значыць, пад шырокім міжнародным кантролем Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў на ўсіх этапах выбарчай кампаніі і з удзелам міжнародных кантралёраў у назіраньні за падлікам галасоў).

Мы заклікаем грамадзтва быць уважлівым і даць адпор любым выбарчым авантурам антыбеларускага рэжыму, не дапусьціць правядзеньне чарговага незаконнага рэфэрэндуму.

*Кіраўніцтва Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"*
*і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*
*14 сакавіка, Менск*

# ЗАХОПНІЦКАЯ ПРАПАНОВА

Так званы „канстытуцыйны акт", што прапануе Масква беларусам аб паглынаньні нашай краіны — гэта ёсьць палітычная форма агрэсіі і пасягненьня на нашую дзяржаву. Гэты акт беларусамі не павінен абмяркоўвацца. Тут мусіць быць нота абурэньня і пратэсту на непрыхільнае захаваньне Расеі адносна Беларусі.

***Беларусы павінны адкінуць прапанову любога рэфэрэндуму на гэтую тэму і ня ўдзельнічаць у чужых авантурах.***

Ужо быў 1922 год, былі Савецкі саюз, тэрор, Курапаты, мільёны забітых беларусаў і паранойныя дыктатары. І пра гэта беларусам у дачыненьнях з Расеяй трэба памятаць вечна.

*17 сакавіка 2003 г.* ***Зянон ПАЗЬНЯК***

# АБ АНТЫКАНСТЫТУЦЫЙНЫХ ДЗЕЯНЬНЯХ ПА ЎВЯДЗЕНЬНІ РАСЕЙСКАГА РУБЛЯ Ў БЕЛАРУСІ

Апошнім часам рэзка зьнізіўся жыцьцёвы ўзровень насельніцтва нашай краіны. Несуразьмерна падвышана аплата за камунальныя паслугі, цяпло, электраэнэргію, усе віды паліва, транспарт. Фактычна замарожаны зарплаты і пэнсіі. Гэта ўсё ёсьць наступствы антыканстытуцыйнай „саюзнай" палітыкі Лукашэнкі і Пуціна, іх незаконных дзеяньняў па ўвядзеньні расейскага рубля ў Беларусі.

19-20 студзеня 2003 г. Лукашэнка прымаў у Менску сваіх маскоўскіх гаспадароў. Разам з Пуціным прыляцела ўся верхавіна расейскай імпэрскай улады. Гэты „візіт" пацьвердзіў намеры імпэрскай Масквы завершыць акупацыю Беларусі ў 2003 г. У эканамічным паняволеньні Беларусі краіна-акупант Расея робіць стаўку на расейскі рубель.

Пётр Пракаповіч, старшыня Нацыянальнага банку Рэспублікі Беларусь, агучыў вынікі лукашэнкаўска-пуцінскай змовы, якая адбылася 19-20 студзеня 2003 г. З 1-га ліпеня 2003 г. у Беларусі ўводзіцца безнаяўны расейскі рубель, і беларускі рубель жорстка прывязваецца да расейскага.

Умовы і дзеяньні па ўвядзеньні расейскага рубля дыктуюцца Масквой. Гэта азначае, што з 1 ліпеня 2003 г. Масква бярэ пад жорсткі кантроль грашова-крэдытную і эмісійную палітыку Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

За інфармацыйнай хлусьнёй у СМІ пра тое, што ўвядзеньне расейскага




*Канфэрэнцыя „Ідэалы БНР і Адраджэньне Беларусі". Менск, 2003г.*

рубля плянуецца, маўляў, толькі з 1 студзеня 2005 г., а таксама за развагамі „экспэртаў" пра выгоду альбо невыгоду ад увядзеньня безнаяўнага расейскага рубля рэжым не можа схаваць свае антыдзяржаўныя дзеяньні. Беларускі народ рэальна расплочваецца матэрыяльнымі рэсурсамі за антыдзяржаўную палітыку. Пры ўвядзеньні расейскага рубля беларусы дадаткова мусяць аплочваць расейскую карупцыю, войны і ўзбагачэньне алігархаў.

Мы заяўляем, што змова антыбеларускага рэжыму Лукашэнкі і імпэрскага рэжыму Пуціна аб увядзеньні расейскага рубля ў Беларусі незаконная, яна супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і інтарэсам беларускага народа.

Мы папярэджваем расейскія імпэрскія колы, што іхныя дзеяньні супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і кваліфікуюцца беларусамі як агрэсія супраць нашай краіны.

Мы заклікаем грамадзянаў Беларусі не супрацоўнічаць з антыбеларускім прамаскоўскім рэжымам Лукашэнкі, не спрыяць прызнаньню яго ўлады за легітымную, не ўдзельнічаць у выбарах і рэфэрэндумах, якія арганізоўвае рэжым.

***Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***
*8 лютага 2003 г., Менск*

# ПРЫСЬВЯЧАЕЦЦА ДНЮ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

*16 сакавіка* фронтаўцы Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ сабраліся ў парку Янкі Купалы ў Менску каля помніка Вялікаму Песьняру. Выступы і паэтычныя чытаньні былі прысьвечаныя Дню Незалежнасьці, 85-м угодкам Беларускай Народнай Рэспублікі. Выступілі *спадары* ***Юры Беленькі***, ***Анатоль Крыварот***, ***Уладзімер Раманцоў***. Яны гаварылі, што цяперашняя сітуацыя падобная на акупацыйную драму 1918 году, і наш народ павінен гуртавацца, каб абараніць сваю волю і незалежнасьць ад расейскай агрэсіі. Сілу нам надаюць геніі нашай паэзіі.

Людзі дэклямавалі каля помніка ***Купалу*** ягоныя вершы, творы ***Уладзімера Караткевіча*** і ***Ніла Гілевіча***. Да грамады далучылася шмат маладых людзей.

Мерапрыемствы, прысьвечаныя Дню Незалежнасьці, фронтаўцы праводзяць па ўсёй краіне.

***(Інфа)***

# ЗАТРЫМАНЬНЕ

*21 сакавіка* ў цэнтры Менска на вул. Гвардзейскай быў затрыманы ўзброеным міліцэйскім патрулём *спадар* ***Аляксей Лапенка***, сябра Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Міліцыянты даставілі спадара Лапенку ў Цэнтральны РУУС, абвінавціўшы ў расклейцы ўлётак ў гонар 85-й гадавіны БНР. Быў складзены пратакол.

# ІДЭАЛЫ БНР І АДРАДЖЭНЬНЕ БЕЛАРУСІ

*22 сакавіка 2003 г. Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* і ягоная *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ* правялі ў Менску Другую штогадовую навукова-практычную канфэрэнцыю ***„Ідэалы БНР і Адраджэньне Беларусі"*** у межах праграмы партыйных мерапрыемстваў, прысьвечаных *85-м угодкам Беларускай Народнай Рэспублікі*. У канфэрэнцыі ўзялі ўдзел больш за 300 асобаў: вядомыя навукоўцы, літаратары, грамадзкія дзеячы, прадстаўнікі дыпляматычнага корпусу, сябры Фронту і Партыі з усіх рэгіёнаў краіны. Удзельнікі распачалі працу сьпяваньнем *гімну* ***„Мы выйдзем шчыльнымі радамі"***. Потым быў заслуханы даклад на тэму *„Ідэалы БНР у рэчышчы геапалітыкі"* кандыдата мастацтвазнаўства *Зянона Пазьняка*, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ.

З дакладамі выступілі *акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук* ***Радзім Гарэцкі***, *доктар гістарычных навук* ***Анатоль Грыцкевіч***, *прафэсар, доктар філалагічных навук* ***Аляксей Рагуля***, *прафэсар, доктар тэхнічных навук* ***Пётр Касьцюковіч***, сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ: кандыдат тэхнічных навук ***Марат Гірко***, кандыдат філалагічных навук ***Валянціна Мароз***, дэпутат Вярхоўнага Савета 12-га скліканьня, эканаміст ***Мікола Крыжаноўскі***, гісторык ***Анатоль Крыварот***, мастацтвазнаўца ***Валеры Буйвал***, намесьнікі старшыні Партыі і БНФ „Адраджэньне" эканаміст ***Юры Беленькі***, інжынер ***Сяргей Папкоў***. Выступоўцы разгледзелі розныя аспэкты вялікай гістарычнай тэмы аднаўленьня незалежнасьці Беларусі ў 1918 г. ў сьвятле шматвяковай беларускай гісторыі і сёньняшняга часу, закранулі пытаньні палітыкі, эканомікі, культуры, міжнародных дачыненьняў. Удзельнікі аднадушна адзначылі актуальнасьць ідэй БНР, жыцьцядайнасьць вялікага гістарычнага досьведу беларускага народу. Было падкрэсьлена, што спробы расейскага імпэрыялізму захапіць Беларусь будуць сустрэтыя народным супрацівам агрэсіі. Быў таксама прэзэнтаваны зборнік дакладаў мінулагодняй Першай канфэрэнцыі. Канфэрэнцыя скончылася сьпяваньнем *гімну* ***„Магутны Божа"***.

***Прэс-служба БНФ. В. БУЙВАЛ***

## РЭПРЭСІІ

*23 сакавіка* сотні людзей сабраліся на плошчы Незалежнасьці ў цэнтры Менска, каб урачыста адзначыць ***85-я ўгодкі абвяшчэньня незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі***. Настрой быў сьвяточны і ўрачысты. Аднак антыбеларускі рэжым кінуў супраць мірнага сьвяточнага шэсьця шматлікія міліцэйскія сілы. Двары і вуліцы на подступах да пл. Незалежнасьці былі поўныя міліцэйскіх патрулёў, кагэбістаў, правакатараў, аўтобусаў з байцамі АМОН. Людзей пачалі затрымліваць яшчэ да пачатку шэсьця. А 12.20 аддзелы АМОН перагарадзілі ланцугамі праспэкт Скарыны каля будынка Галоўпаштамта і атакавалі людзей, якія ішлі пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі* і сьпявалі *гімн* ***„Магутны Божа"***. Галаварэзы білі людзей дубінкамі і нагамі, валілі і валаклі людзей па асфальту, заштурхвалі ў падагнаныя міліцэйскія аўтобусы. Было затрымана больш за **50** асобаў, у тым ліку больш за **20** асобаў – сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ (сярод іх намесьнік старшыні Партыі і БНФ „Адраджэньне" ***Сяргей Папкоў***).

Большасьць затрыманых прымусілі прайсьці прыніжальную працэдуру: ў Леніскім і Маскоўскім РУУС іх сфатаграфавалі, як злачынцаў, і зьнялі адбіткі пальцаў. Праз 2-3 гадзіны большасьць з затрыманых былі адпушчаныя з позвамі ў суд. Аднак у спэцпрыёмнік-разьмеркавальнік на Акрэсьціна былі адпраўленыя ***Уладзімер Юхо***, ***Алег Сагадзін*** і ***Анатоль Рабкавец***.

Жорсткая міліцэйская акцыя супраць мірных грамадзянаў і беларускіх ідэй сьведчыць пра страх мізэрнага рэжыму, дэманструе яго акупацыйную сутнасьць.

***(Прэс-служба БНФ. В. БУЙВАЛ)***

## СУДОВАЯ РАСПРАВА НАД УДЗЕЛЬНІКАМІ СЬВЯТКАВАНЬНЯ ДНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

*24 сакавіка* ў судзе Ленінскага раёну сталіцы адбыліся суды над затрыманымі ўдзельнікамі сьвяточнага шэсьця ў гонар *85-х угодкаў незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі*, якое адбылося 23 сакавіка ў цэнтры Менску. Гэта быў сапраўдны канвэер бясправўя. Як заўсёды, ілжэсьведкамі выступалі міліцыянты, якія блыталіся ў сваіх паказаньнях. Напісаныя паводле аднаго ўзору міліцэйскія пратаколы служылі „доказным" матэр'ялам. Суддзі парушалі працэдуру і дзеючае заканадаўства, выконваючы заказ антынароднага рэжыму. Але зьявіліся новыя рысы, якія так выразна не вызначалі дзейнасьць мясцовай Фэміды ў папярэднія гады. Па-першае, калі раней затрыманых патрыётаў судзілі і асуджвалі за „стварэньне перашкодаў грамадзкаму транспарту", за „супраціў работнікам міліцыі" і г.д., імкнучыся пазьбегнуць палітычнай афарбоўкі судовых прысудаў, то на гэты раз галоўнымі абвінавачаньнямі былі: „выкрикивал лозунг „Жыве Беларусь!" и размахивал бело-красно-белым флагом".

На першы погляд, гэта фармальныя зьмены абвінавачаньняў. Але на самой справе яны сьведчаць пра непараўнальную па свайму цынізму, адкрыта ***антыбеларускую, антыдзяржаўную дзейнасьць*** супраць грамадзянаў Беларусі і супраць незалежнай Беларускай Дзяржавы якраз тых чыноўнікаў, якія павінны абараняць грамадзянаў і нашу дзяржаву. Прамаскоўскі рэжым, не крыючыся, нават не хаваючыся за шырму „аховы грамадзкага парадку", зьдзейсьніў акт антыдзяржаўнага выступленьня. Грамадзянаў Беларусі судзілі і абвінавацілі за „злачынствы": любоў да сваёй Айчыны-Беларусі і за вернасьць нацыянальнаму, асьвечанаму стагоддзямі ***Бел-Чырвона-Беламу Сьцягу***. Рэжым прадэманстраваў, што ён зьяўляецца варожай нашаму народу і нашай дзяржаве прыладай каляніяльнай расейскай агрэсіі.

Але гэты рэжым баіцца адказнасьці. Будынак суда быў перапоўнены міліцыянтамі ва ўніформах і ў цывільным. Некалькі разоў міліцыянты паспрабавалі выдаліць з будынку суда людзей, якія прыйшлі падтрымаць падсудных (працэсы былі фармальна адкрытыя). Калі гэта не ўдалося зрабіць, міліцыя перакрыла доступ у будынак суда.

На працягу дня былі асуджаныя сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*: ***Мікалай Стоцік*** (штраф у 20 мінімальных заробкаў), ***Натальля Васілевіч*** і ***Алег Сагадзін***, якія былі жорстка зьбітыя ОМОНам падчас затрыманьня, атрымалі папярэджаньне, ***Анатоль Рабкавец*** (штраф у 30 мінімальных заробкаў), ***Уладзімер Юхо*** (7 сутак адміністрацыйнага арышту), нам. старшыні Партыі і БНФ „Адраджэньне" ***Сяргей Папкоў*** (штраф у 20 мінімальных заробкаў).

Шалёны націск на беларусаў з боку мясцовай каляніяльнай адміністрацыі, якая ненавідзіць усё беларускае, дае трывожны знак усяму народу: над намі, нашымі дзецьмі, нашай дзяржавай і будучыняй навісла пагроза. Спосабам абароны ад расейскай агрэсіі, якая разбурае Беларусь, ёсьць ***Беларуская Салідарнасьць*** *на аснове нашых нацыянальных інтарэсаў і наш агульны супраціў.*

***(Інфармацыйная камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. В. БУЙВАЛ)***

## БНР У АБШАРЫ МІНУЛАГА І БУДУЧЫНІ

*БНР* і *Сакавік* сталі для нас, беларусаў, вялікім сакральным сымвалам. Гэта зьява, па якой мераецца сьведамасьць і ацэньваецца годнасьць асобы. Гэта зьмест, па якім вызначаецца беларус.

Адначасна БНР гэта ёсьць палітычная рэальнасьць. Вось ужо 85 гадоў, як існуе *Рада Беларускай Народнай Рэспублікі*. 85 гадоў яна прадстаўляе цяглась беларускай улады, нязьменнасьць ідэяў беларускай незалежнасьці і сьветласьць ідэалаў свабоды. 85 гадоў яна ўплывае на палітычную рэальнасьць Беларусі. Гэта бясспрэчны факт, і яго трэба ўлічваць, думаючы пра пэрспэктыву.

Утварэньне незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі азначала адраджэньне нацыі з палітычнага небыцьця. Быў пакладзены пачатак будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы.

У канцы 1918 года пачалася расейская акупацыя Беларусі, якая доўжылася (зь невялікімі перапынкамі) 73 гады. Падкрэсьлю, аднак, што

мірны дагавор Беларускай Народнай Рэспублікі з Расеяй ня быў падпісаны, і фармальна БНР знаходзіцца ў дачыненьні да Расеі ў стане вайны. Пра гэта ня трэба забываць, асабліва цяпер, калі набліжаецца верагоднасьць збройнага змаганьня за незалежнасьць Рэспублікі Беларусь.

Расейскія бальшавікі не маглі не лічыцца з існаваньнем Беларускай Народнай Рэспублікі, плянуючы пэрспэктыву свайго панаваньня на акупаванай Беларусі. Гэтая акалічнасьць паспрыяла таму, што яны вымушаныя былі пагадзіцца на ўтварэньне БССР, на чым настойвалі левыя беларускія палітыкі, што супрацоўнічалі з бальшавікамі. Неўзабаве ў Смаленску быў створаны беларускі камуністычны ўрад, і першага студзеня 1919 года аб'яўлена пра стварэньне БССР У кантэксьце нацыянальнага існаваньня гэта быў факт станоўчы.

Урад і Рада БНР апынуліся на выгнаньні. Тут яны разгарнулі палітычную дзейнасьць за вызваленьне Беларусі з бальшавіцкай няволі і па інфармаваньні палітычных колаў Захаду пра беларускую рэальнасьць.

Велізарнай заслугай Рады БНР і беларусаў у замежжы было тое, што яны ідэйна абаранілі, узьвялічылі і перахавалі да сёньняшніх дзён вялікія ідэалы незалежнасьці, ідэі і сымвалы Беларускай Народнай Рэспублікі.

Кожны з гэтых беларусаў верыў, што Беларусь адродзіцца і адновіць незалежнасьць. Гэтая вера трымала іх. Памятаю надпіс, зроблены ў 1956 годзе на падарункавым фота аднаго беларускага афіцэра: „Распусьцяцца бярозы — мы вернемся дамоў". І гэтак — паўстагоддзя. Бальшыня не вярнулася, не дажыла. Але вярнуліся ідэі, гісторыя, сымвалы і нацыянальныя каштоўнасьці, што адвавалі і зьберагі мінулыя пакаленьні. І гэта для нас, беларусаў, таксама ёсьць змаганьне і вялікая барацьба.

У гісторыі дачыненьняў БНР трэба зьвярнуць увагу на той факт, як сур'ёзна і хваравіта адносіцца Масква да існаваньня і дзейнасьці БНР. Пачынаючы з 1919 года, расейская дыпляматыя і агентура прыклалі шмат намаганьняў, каб расколоць Урад БНР і заманіць дзеячоў Беларускай Народнай Рэспублікі ў БССР.

Інтэлігенцкі ідэалізм некаторых беларускіх дзеячоў, адсутнасьць вялікага палітычнага вопыту і, як ні дзіўна, дрэннае веданьне расейцаў, прывялі да таго, што энкавэдзісцкая авантура ўдалася, Урад БНР раскалолі, і ў сярэдзіне 1920-х гадоў частка беларускіх змагароў прыехала ў БССР. Неўзабаве ўсе яны былі расстраляныя.

Барацьбу супраць БНР расейцы не спынялі і ў 1930-х гадах, і асабліва пасьля вайны, калі стараньнямі ***Прэзыдэнта Міколы Абрамчыка*** была адноўлена дзейнасьць Рады БНР (пасьля сьмерці ***Прэзыдэнта БНР Васіля Захаркі***).

У пасьляваенны час КГБ праз свае крэатуры стварыў нават фальсіфікатарскую канцэпцыю ў гістарычнай навуцы аб быццам бы недасканаласьці, няважнасьці і нязначнасьці БНР. На гэбоўскую фальсіфікатарскую распрацоўку спасылаюцца і цяпер расейскія прапагандысты ў гістарычнай навуцы.

Заўсёды карысна аналізаваць палітычную рэакцыю праціўнікаў, каб ацаніць ступень палітычнай важнасьці сваіх дзеяньняў. Дык вось, Масква ніколі не прапускала міма вушэй дзеяньняў БНР і дзеяньняў беларускіх адраджэнцаў у Беларусі, накіраваных на лучнасьць з ідэямі і фактарам існаваньня БНР у беларускай вызвольнай палітыцы. Рэакцыя была часам даволі нэрвовай. Беларускі Народны Фронт зьведаў яе на сабе ад самага пачатку.

Выразна адлюстраваліся, напрыклад, такія паводзіны Масквы ў 1997 годзе, калі Народны Фронт пасьля лістападаўскага антыканстытуцыйнага перавароту (ў 1996 годзе) прыступіў да вельмі важнай нацыянальна-патрыятычнай і кансалідуючай акцыіі ***„Грамадзянства БНР"***. Пасьпяховая напачатку і пэрспэктыўная акцыя была ўсё ж такі сарваная, з прычыны (перш за ўсё) глыбокага ўжо да таго часу ўнутранага расколу БНФ і з прычыны паўсюднай актывізацыі антыадраджэнскай гэбоўскай агентуры. Шэраг экзальтаваных антыбеларускіх артыкулаў, якія зьявіліся тады на гэтую тэму (і тэму БНР) у расейскім, перш за ўсё, камуністычным друку, наводзяць на пэўныя разважаньні.

Цікава, што перад гэтым, яшчэ ў 1993 годзе, была спроба з боку былой савецкай намэнклятуры намовіць прадстаўнікоў Рады БНР да перадачы сваіх паўнамоцтваў ураду Рэспублікі Беларусь. (Тактыка, як у 1920-х гадах.) Аднак, дзеячы беларускай эміграцыі цяпер ужо не зрабілі памылкі. Рада БНР дзейнічае і жыве.

Далейшыя падзеі паказалі, як важна для Беларусі, што засталася Рада БНР і што яна не ашукалася, не здала пад уплывам незалежніцкай эйфарыі свае паўнамоцтвы здрадніцкаму намэнклятурна-каляніяльнаму савецкаму ўраду. Як важна, што жыве рэальна вялікая справа Беларускага Адраджэньня!

Якую галоўную выснову мы павінны зрабіць з цяперашняй сучаснасьці і з усёй гісторыі БНР? А такую, што да БНР мы павінны адносіцца ня толькі, як да ідэі, ня толькі, як да сымвала і ідэальнага вобраза, а як да палітычнай актуальнасьці і пэрспэктывы нашай вольнай нацыянальнай будучыні.

Цяперашняя Рэспубліка Беларусь мае цягласьць ад БССР. Адсюль хвароба прыроды, хвароба паходжаньня ўлады. Хвароба паходжаньня спарадзіла Лукашэнку і шукае ганчарыкаў. Не пераменіцца ўлада, пакуль не пераменяцца ідэі.

Нашыя беларускія ідэі, ідэі беларускай незалежнай будучыні — гэта ёсьць ідэі БНР. Калі мы хочам нашу вольную, народную будучыню мець, — мы павінны вярнуць і ўсталяваць Беларускую Народную Рэспубліку як палітычную рэчаіснасьць. БНР — гэта не ўчарашні дзень. Гэта змагарная сучаснасьць і наша будучыня. Такая ёсьць праўда.

*22 сакавіка 2003 г.*
*Вільня*

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***(Канфэрэнцыя ТБК, прысьвечаная 85-м угодкам БНР)***

# БНР У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫЦЫ

85-я ўгодкі абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі наша краіна сустракае ў стане, калі яе дзяржаўны суверэнітэт знаходзіцца пад пагрозай скасаваньня. Беларусь у чарговы раз рызыкуе стаць ахвярай міжнароднага перадзелу ўлады, тэрыторыяў і рэсурсаў, бо новы расейска-нямецкі (пераважна антыамэрыканскі) хаўрус зноў падзяліў Эўрапейскі кантынент па свайму капылу і густу на зоны ўплыву і паглынаньня і праводзіць узгодненую палітыку ў дачыненьні да Беларусі.

У сувязі з гэтым ёсць сэнс прыгадаць, што ўтварэньне і абвяшчэньне незалежнасьці БНР сталася беларускім адказам на Берасцейскую змову бальшавіцкай Расеі і Нямеччыны, якія, не спытаўшыся думкі беларусаў, 3 сакавіка 1918 году парвалі наш край на шматкі.

Сёньня, у выніку палітыкі паўзучай унутранай акупацыі з боку Расеі, якой удалося захаваць на нашай зямлі ўладу сваёй каляніяльнай адміністрацыі, а таксама дзякуючы пэрманентнай здрадзе беларускай псэўдаапазіцыі, на парадку дня стаіць пытаньне аб інкарпарацыі нашай Бацькаўшчыны ў склад Расейскай федэрацыі. Таму мы зноў мусім зьвяртацца да БНР. Але зьвяртацца да БНР сёньня мы мусім не як да гістарычнага факту, але як да гаранта беларускай дзяржаўнасьці, як да магчымай рэальнай палітычнай апоры сучаснага беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху ў барацьбе за незалежнасьць і суверэнітэт Беларусі. Думаю, што БНР, яе Рада павінны стаць апорай НВР, стаць рэальнай палітычнай сілай, цэнтрам кансалідацыі дзяржаватворчых намаганьняў беларусаў. Але можа і ня стаць, калі толькі Рада апынецца пад уплывам псэўдаапазіцыі, якая, кажучы вобразна, прадаўшы Беларусь, ужо з імпэтам рыхтуецца да выбараў у дзяржаўную думу Расеі, каб разам з нашчадкамі імпэрыі Чынгіз-хана ісьці ў Эўропу „да апошняга мора".

Між іншым, няцяжка здагадацца, што ў межах пляна легітымізацыі анэксіі Беларусі Расеяй, у вачах міжнароднай супольнасьці Радзе БНР адведзена пэўная роля. Магчыма, гэтая роля зусім пасіўная, калі Рада проста застаецца малазначным архаічным палітказусам, зь якім можна папросту не лічыцца ў рэальнай палітычнай барацьбе. Магчыма і больш

актыўная роля, калі Рада тым ці іншым спосабам павінна асьвяціць інкарпарацыю (прыкладам, ухваліўшы яе як акт вызваленьня беларусаў ад дыктатуры і далучэньня іх да „дэмакратычнай” прасторы). Магчыма, прадугледжаны і самароспуск Рады або яе поўная дыскрэдытацыя, каб дасягнуць канчатковага палітычнага вырашэння беларускага пытаньня.

Як жа рэальна павядзе сябе Рада БНР ва ўмовах, калі Эўропа гатовая заплюшчыць вочы на беларускую драму, гатова зрабіць выгляд, што расейская акупацыя насамрэч ёсць спрадвечная мара беларусаў, а псэўдавыбары і псэўдарэферэндумы ёсць механізм дэмакратычнага волевыяўлення беларускіх грамадзянаў?




***Мал.1. Мадэль палітычнай прасторы Беларусі.***

Гэта будзе залежыць ад Рады БНР, ад палітычнай волі і сьвядомасці яе сяброў. Аднак гэта будзе залежаць ня толькі ад яе, але і ад палітычнай волі беларускага НВР, бо вядома, што караля гуляе сьвіта, а кароль, чые загады ніхто не выконвае, ператвараецца ў блазна.

Як жа вызначыць ролю БНР і яе Рады ў сучасным сьвеце? Пытаньне гэтае вымагае ўсебаковага разгляду.

Найперш трэба пабудаваць адэкватную мадэль палітычнай прасторы краіны. Для чаго — вызначыць яе структуру, галоўныя палітычныя сілы, іхныя функцыі, сацыяльную базу, унутрыпалітычныя і зьнешнепалітычныя вектары дзейнасьці. Адзін з варыянтаў такой мадэлі прадстаўлены на *мал.1*.

**Нацыянальна-Вызвольнаму руху**, які адлюстроўвае сапраўдныя інтарэсы беларускага народу, па лініі ***„суверэнітэт — анэксіянізм”*** супрацьстаяць дзьве генетычна зьвязаныя паміж сабой палітычныя сілы: **Каляніяльная адміністрацыя** і **Аб’яднаная псэўдаапазыцыя**, якія на




***Мал.2. Варыянт структурнай арганізацыі змаганьня за дзяржаўнасьць Беларусі з удзелам Рады БНР і НВР.***

беларускім палітычным полі выступаюць як дзьве рукі расейскага імпэрыялізму.

Функцыянальна Каляніяльная адміністрацыя на чале з „прэзыдэнтам” займаецца падаўленьнем Нацыянальна-Вызвольнага руху і рэальна забясьпечвае ажыцьцяўленьне расейскіх нацыянальных інтарэсаў на Беларусі. Аб’яднаная псэўдаапазыцыя функцыянальна забясьпечвае стварэньне псэўдаальтэрнатывы рэжыму ў вачах як беларускага народу, гэтак і міжнароднай супольнасьці. Дзеля гэтага яна змагаецца супраць НВР, імкнучыся яго дыскрэдытаваць, разбурыць і абяскровіць, пазбавіўшы найперш людскіх рэсурсаў унутры краіны і міжнароднай падтрымкі за яе межамі. Адначасова Аб’яднаная псэўдаапазыцыя выконвае функцыю кантролю за дзейнасьцю Каляніяльнай адміністрацыі з боку Расеі, якая з дапамогай „аб’яднаных” захоўвае высокую ступень кіруемасьці беларускага палітычнага працэсу і не дазваляе свавольнічаць сваёй каляніяльнай адміністрацыі. (Дарэчы, тая частка Аб’яднанай апазыцыі, якая ня можа непасрэдна і адкрыта супрацоўнічаць з Расейскім кіраўніцтвам, кантралюецца Нямеччынай і некаторымі міжнароднымі структурамі, якія знаходзяцца пад моцным нямецкім уплывам. Пры тым трэба памятаць, што Нямеччына і Расея праводзяць у дачыненьні да Беларусі цалкам узгодненую палітыку.)

Адначасова трэба разабрацца ў тым, якія легітымныя структуры ўлады і асобы засталіся на беларускім палітычным полі, у якім стане яны рэальна знаходзяцца, якую пазыцыю займаюць, пад чыім уплывам знаходзяцца, які палітычны патэнцыял маюць і на што яны ў прынцыпе здольныя. Затым трэба разабрацца ў тым, якіх структурных, арганізацыйных, прававых, рэсурсных, маральна-псіхалягічных чыньнікаў не хапае, каб сфармаваць дзеяздольную і ўстойлівую, нацыянальна арыентаваную незалежніцкую палітычную структуру і вызначыць месца, якое ў ёй можа заняць Рада БНР.

Магчымы варыянт структурнай арганізацыі змаганьня за дзяржаўнасьць Беларусі з удзелам Рады БНР і НВР прадстаўлены на *мал.2*.

Ступень легітымнасьці Рады БНР і ступень яе аўтарытэту ўнутры і за межамі Беларусі мог бы ўзьняць абраны пад яе эгідай і пры дапамозе структур НВР *Грамадзянскі парлямант*. Апошні мог бы выступіць пасярэднікам паміж Радай БНР і беларускім народам, які адзін ёсць сапраўднай крыніцай улады. Адначасова Грамадзянскі парлямант супольна са структурамі НВР і беларускага самакіраваньня мог бы стаць правадніком легітымнай выканаўчай улады на Беларусі.

Што тычыцца самой Рады БНР, то яе палітычнае значэньне як легітымнай дзяржаўнай структуры БНР ва ўмовах скасаваньня суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, можа надзвычай узрасьці. Тады ідэя Адраджэньня Беларускай Народнай Рэспублікі запатрабуе неадкладнага рэальнага ўвасабленьня. Думаю, што трэба быць да гэтага гатовымі ўжо цяпер.

*22 сакавіка 2003 г.* ***Уладзімер СТАРЧАНКА***

# КАМПАНІЯ НЕВЯЛІКАЯ, АЛЕ...

**Леанід Козік** — сустаршыня „Сабору славянскіх народаў” зь беларускага боку, (зарэгістраваны ў Маскве); узначальвае Фэдэрацыю прафсаюзаў Беларусі, беларуска-іракскую Камісію па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і Беларуска-расейскую рабочую групу па распрацоўцы антызаконнага праекту „канстытуцыйнага акту” („саюзу” Беларусі і Расеі).

У „Сабор” уваходзяць Э. **Малафееў**, **Н**. **Машэрава**, **М**. **Чаргінец** і іншыя тыпажы.

***АМ.***

# УКРАЛІ КРЫЖ

*Лідзкі раён. 15 верасьня* мясцовы ксёндз асьвяціў Крыж, які быў пасьвечаны падзеі ***1659*** году. Тады лідзкая шляхта суткі стрымлівала ля нёманскага броду маскоўскае войска, якое рухалася на Горадню.

Дубовы крыж узвышаўся на 6,5 мэтра. Зрабіць яго і ўсталяваць дапамагалі дзясяткі людзей (працавалі на ахвяру — бясплатна).

Напачатку кастрычніка лідзкія раённыя ўлады загадалі дэмантаваць крыж коштам таго, хто яго паставіў (ініцыятар — ТБМ). ***Станіслаў Суднік*** дамовіўся, каб улады не сьпяшаліся. Яго абавязалі атрымаць згоду на крыж у архітэктурнай ды іншых службах, зрабіць запыт у Інстытут гісторыі Акадэміі Навук Беларусі.

З інстытуту прыйшло пацьверджаньне, што ў сьнежні 1659 года лідзкае шляхецкае рушэньне ўступіла ў бой з войскам ваяводы Хаванскага і што бой, праўдападобна, адбыўся каля вёскі *Беліца*.

Аднак пасьля гэтага ў канцы лістапада акупацыйныя ўлады зьнялі крыж, бо ён нагадваў беларусам пра змаганьне продкаў з маскоўскімі акупантамі.

Крыж бясьследна зьнік.

***(Інфа)***

# НОЖ У ПЛЕЧЫ

Тое, што на паседжаньні Парляманцкай Асамблеі АБСЭ ў Вене 19-га лютага АБСЭ фактычна прызнала нелегітымную „палату" лукашэнкаўскага рэжыму на Беларусі і ўключыла яе дэлегацыю ў свой склад, — гэта ёсьць, калі казаць вобразна, іржавы нож у плечы незалежнай Беларусі. Калі коратка: Эўропа прадала Беларусь Маскве. І няважна, што гэты акт разглядаецца як працэдурнае пытаньне.

Для мяне гэта ня ёсьць нечаканасьцю. ***Палітыка АБСЭ — гэта палітыка падвойных стандартаў.*** На Беларусі, гэтак жа, як у Чачэніі і Аўганістане, яна выявілася найбольш яскрава. Я асабіста, і Народны Фронт, які я ўзначальваю, змагаліся і змагаемся з гэтай палітыкай ужо пяць гадоў. Мы пра гэта пісалі, казалі, выступалі, заяўлялі, паўсюдна і ўвесь час.

З 1998 года галоўная мэта Ганса-Георга Віка (тагачаснага кіраўніка Місіі АБСЭ ў Менску) была — падрыхтаваць умовы для анэксіі Беларусі Расеяй. У гэтым ён сам прызнаўся ў верасьні 2000 году ў Беластоку. Вікам былі пастаўленыя дзьве задачы:

1. разбурыць Беларускі Народны Фронт і стварыць ненацыянальную апазыцыю ў Беларусі, дзе будуць змагацца за дэмакратыю без суверэнітэту;
2. выдаліць з палітыкі Сымона Шарэцкага. (Бо гэта адзіная кіруючая легітымная фігура ў беларускай уладзе.)

Фронт зьнішчыць не ўдалося, але пры дапамозе расейскай агентуры яго раскалолі.

Пасьля выдаленьня Шарэцкага зь дзейнай палітыкі (да чаго Вік прыклаўся найбольш) нямецкая група АБСЭ, якую ўзначальвае Вік, пайшла ў наступ. Вік аб'явіў, што дзейнасьць Вярхоўнага Савета 13-га скліканьня скончылася. (Пра хлусьлівасьць гэтай заявы Віка была зьмешчана мая рэпліка ў друку.)



Фота: „Белорусская газета"

***Фраў Цапф узіраецца на Беларусь.***

Я пісаў таксама пра супрацоўніцтва Віка з рэжымам Лукашэнкі.

Цяпер у кантэксьце стварэньня новай палітычнай восі ***Парыж — Бэрлін — Масква*** адбылася легалізацыя гэтай падвойнай палітыкі АБСЭ.

Для Беларусі гэта будзе азначаць легалізацыю расейскай анэксіі, зацьверджаньне акупацыі.

Нагадаю, што, пачынаючы ад 1992 года, ***ідзе змаганьне за Беларусь з расейскім імпэрыялізмам***. Вось сутнасьць канфлікту і ўсяго, што на Беларусі адбываецца.

Зьнешнія сілы імпэрыялізму, скарыстаўшы Лукашэнку, змагаюцца за падпарадкаваньне і захоп Беларусі, а беларусам прапануюць змагацца не за Беларусь, а за „дэмакратыю" (не за галаву, а за валасы на галаве). І немцы ў структурах АБСЭ тут першыя саюзьнікі расейскай захопніцкай агрэсіі. У гэтым сутнасьць падвойнай палітыкі АБСЭ на Беларусі.

Што цяпер рабіць? Прынятае рашэньне — безумоўная памылка АБСЭ.

Першае: мы не пагодзімся з такой палітыкай АБСЭ. Мы не пагодзімся, каб нямецкая палітычная група прыватызавала цэлую міжнародную арганізацыю АБСЭ, каб толькі немцы прадстаўлялі АБСЭ ў Беларусі, каб вікі і цапфы вырашалі беларускі лёс. Тут ня пахне ні дэмакратыяй, ні прыстойнасьцю, а толькі грубым нямецкім прагматызмам.

Другое: мы павінны апэляваць да свайго грамадзтва, каб яно рыхтавалася да ўсіх формаў змаганьня за свабоду і незалежнасьць. Такая ёсьць праўда, і такая ёсьць жорсткая рэальнасьць. Трэба ўступаць у БКА, пашыраць і ствараць Камітэты Абароны.

Трэцяе: мы мусім апэляваць да Злучаных Штатаў Амэрыкі і Вялікабрытаніі (краінаў-гарантаў беларускага суверэнітэту), каб яны рэальна падтрымалі нашу свабоду і незалежнасьць.

І чацьвёртае: мы, беларусы, мусім усьвядоміць (хто яшчэ не ўсьвядоміў), што ўсім трэба злучыцца вакол Беларускай Нацыянальнай Ідэі і абараніць незалежнасьць Беларускай дзяржавы.

Нельга ўвесь час жыць ілюзіямі, што Расея ці Эўропа дапамогуць Беларусі. Не дапаможа ні Расея, ні Эўропа. І на Ўсходзе, і на Захадзе ствараюцца цяпер новыя імпэрыі, і ***гэтым*** тлумачыцца ўся палітыка. Сіла — ў нас самых. І мы можам рэалізаваць яе, калі толькі таго захочам. І гэта трэба рабіць.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Старшыня Беларускага Народнага***
***Фронту „Адраджэньне", кіраўнік БКА***

*20 лютага 2003 г.*

# ТРЫВОЖНЫЯ ПРАЦЭСЫ

З 1990 па 1999 гады нараджальнасьць у Беларусі зьнізілася на **34,5%**, а сьмяротнасьць — наадварот, узрасла на **26%**. Паводле статыстыкі, колькасьць пабраных шлюбаў скарацілася на **28%**, а колькасьць разводаў павялічылася на **35%**.

За апошнія 7 гадоў беларускае насельніцтва скарацілася на **300** тысячаў чалавек. Гэта найперш за ўсё сталася ў выніку сацыяльна-палітычных умоваў, што стварылі ў Беларусі цяперашнія ўладатрымальнікі і ў выніку сьведамай палітыкі прамаскоўскага рэжыму, накіраванай на вынарадавеньне беларускага насельніцтва.

# ВАЙНА

Ёсьць некалькі прычынаў вайны Амэрыкі на Блізкім Усходзе. Першая — гэта стварэньне дзяржавы Ізраіль і Палестына-Ізраільскі канфлікт (шырэй — араба-ізраільскі канфлікт). Другая — нафта. Трэцяя — галоўная, якая вынікае з першых двух, — гэта непасрэдная пагроза Злучаным Штатам, разьвязваньне радыкальнымі групамі мусульманскага

сьвету міжнароднай партызанска-тэрарыстычнай вайны супраць Амэрыкі.

Пасьля 11 верасьня 2001 года (нападу тэрарыстаў-сьмертнікаў на Вашынгтон і Нью-Ёрк і разбурэньне Сусьветнага Гандлёвага Цэнтру) стала зразумела, што вайна Амэрыкі на Блізкім Усходзе, практычна, непазьбежная, дзеля прадухіленьня эскалацыі тэрарыстычнай вайны. Амэрыка зразумела, што толькі сродкамі аховы, стрымліваньня і абароны яна ня здолее доўга і пасьпяхова супрацьстаяць партызанскаму тэрарызму радакальных ісламістаў. Яна можа пацярпець у гэтай вайне, як толькі нябачны праціўнік атрымае ў свае рукі зброю масавага зьнішчэньня. Стала зразумела, што калі не прыняць хутка рашучых мераў, то нябачныя ворагі Амэрыкі завалодаюць гэтай зброяй.

Зьнішчэньне партызанскага тэрарызму радыкальных ісламістаў Усходу і ліквідацыя пагрозы амэрыканскай дзяржаве ёсьць жыцьцёвай неабходнасьцю Амэрыкі. Ня кажам ужо пра тое, што пастаянныя абарончыя меры каштуюць дорага і не гарантуюць ад ахвяраў.

Першым чынам трэба было ліквідаваць асяродкі тэрарызму і рэжымы, якія маглі стаць базай для тэрарызму, і крыніцай атрыманьня зброі масавага зьнішчэньня.

Гэтак адбылася вайна з талібамі ў Аўганістане і разбурэньне гэтай краіны. Гэтак пачалася і небясьпечная вайна ў Іраку (фармальна — як працяг нафтавай кувэйцкай кампаніі, якую праводзіў старэйшы Буш).

Трэба ўлічыць, што Ірак ня ёсьць тэакратычная ісламісцкая дзяржава. Гэта у цэлым — сьвецкая краіна з даволі разьвітай навукай і з самымі перадавымі ўнівэрсітэтамі на Блізкім Усходзе (Багдад). Ірак мае інтэлектуальныя магчымасьці стварыць зброю масавага зьнішчэньня. Тым часам дыктатура Садама Хусэйна — адна з самых жорсткіх у сьвеце. Усёпаглынаючы страх — такая ёсьць пануючая атмасфэра ў іракцкім грамадзтве.

Усе гэтыя чыньнікі плюс антыамэрыканізм Хусэйна і стан фактычнай вайны з Амэрыкай рабілі збройную інвазію ЗША ў Ірак, практычна, неўнікнёнай. (Няма таксама гарантыяў несупрацоўніцтва Аль-Каіды з Хусэйнам.) Амэрыка па-амэрыканску рэагавала на рэальную пагрозу сваёй бясьпецы.

Такая сутнасьць справы. І менавіта таму прэзыдэнт ЗША адзначыў, што для ваенных дзеяньняў супраць рэжыму Садама Хусэйна ЗША ня мае патрэбы ў згодзе Арганізацыі Аб’едналых Нацыяў і Савета Бясьпекі ААН.

Пазыцыя Заходняй Эўропы ў гэтай вайне — тыповая для эўрапейскага палітычнага філісьцерства. (Успомнім пазыцыю Чэмбэрлена ў дачыненьнях з Гітлерам, здачу Чэхаславаччыны, Аўстрыі, Польшчы і г.д.) Гэта паводзіны здраднікаў і нікчэмных палітыкаў, схаваныя за нібыта „гуманнай” пацыфісцкай дэмагогіяй і подлай інфармацыйнай прапагандай.

Менавіта гэтая, прымітыўна-праўдападобная прапаганда Францыі і Нямеччыны (перш за ўсё) выклікала на вуліцы антываенныя шматтысячныя натоўпы абываццеляў, якім раптам стала шкода мірных іракцаў. Пры гэтым, калі адбываўся генацыд у Чачэніі і рускае тэрарыстычнае войска вынішчала мірнае чачэнскае насельніцтва, тады нешта не відаць было гэтых „міралюбівых” натоўпаў, ня гледзячы, што і чачэнцы, і ўсе сумленныя людзі пастаянна даводзілі інфармацыю пра генацыд у Чачэніі да сусьветнай грамадзкасьці, а ўрады ЗША і Заходняй Эўропы проста кінулі, прадалі чачэнцаў, дзеля прагматычных інтарэсаў з Расеяй. Цяпер гэтыя эгалітарныя ахвяры масавай прапаганды пад лямант з Парыжу і Бэрліну масава выяўляюць сваю нянавісьць да Амэрыкі (якой, дарэчы, абавязаны і сваім эўрапейскім мірам, і сваім мяшчанскім дабрабытам. Я маю на ўвазе канец Другой Сусьветнай вайны, плян Маршала, НАТО, перамогу ў Халоднай вайне і г.д.). Нават расейскі прэзыдэнт Пуцін — спраўца масавых забойстваў чачэнцаў (і няверны прыяцель Амэрыкі) — выступіў у абарону Садама Хусэйна, праліваючы кракадзілавыя сьлёзы па ахвярах вайны. (Ужо хто б што казаў пра ахвяры і „права сілы” — толькі ня Пуцін.)

І немцы, і французы, і расейцы шмат уклалі сродкаў у іракцую нафту і эканоміку. (Якія там „ідэі”, „гуманізм”, „дэмакратыя”! Кожны ратуе свае грошы.) Ініцыятыва амэрыканцаў падважыла б валюту „эўра” і саму ідэю пабудовы новай супэр-імпэрыі ў Эўропе (так званы Эўразьвяз). І раптам гэтак усё агалілася, фактычна, раскалолася НАТО, а Францыя, Нямеччына, Бэльгія, Люксэмбург зьбіраюцца арганізаваць свой ваенны блёк, сваю „абарону Эўропы”. Тут жа стварылася вось *Парыж-Бэрлін-Масква*, якія амаль не хаваючыся пачалі дамаўляцца пра новы перадзел Эўропы на „сфэры ўплыву” (справа йдзе, перш за ўсё пра Беларусь, Украіну і Польшчу, краіны Балтыі, былую Ўсходнюю Прусію — цяперашнюю Калінінградзкую вобласьць).

Як бачым, усё у каторы раз у гісторыі — паўтараецца. Як толькі аб’ядноўваюцца Парыж-Бэрлін з Масквой — акупацыя, анэксія, аншлюс, вайна не за гарамі. Усё гэта ў Эўропе ўжо праходзілі. Выступленьне ж супраць Амэрыкі — гэта самае горшае, да чаго маглі дадумацца цяперашнія ўрады Эўропы.

Характар цяперашняй амэрыканскай вайны на Блізкім Усходзе — зусім іншы, чым папярэдні. Дзеяньне разгортваецца паволі, на выбраных тэрыторыях, авія-налёты ня носяць масавага характару, усё накіравана на як найменшыя страты цывільнага насельніцтва. Тым часам (на першы погляд, парадокс) прыхільнікі Хусэйна, на баку якіх быццам бы маральнае права абароны радзімы, самы страляюць у сваіх мірных уцекачоў і правакуюць ахвяры насельніцтва, каб паказаць па тэлебачаньні і выставіць у дрэнным выглядзе амэрыканцаў, ды выклікаць да сябе спачуваньне ў сьвеце. Вайна — ня толькі крывавая, але і брудная справа.

Як мы, беларусы, павінны адносіцца да гэтай вайны?

Ва ўсіх войнах церпяць нявінныя мірныя людзі. Гэта ёсьць найгоршы бок вайны. Таму за вайной павінен быць міжнародны кантроль, дапамога пацярпелым і мірнаму насельніцтву. Мы не павінны заставацца ўбаку ад агульналюдзкай салідарнасьці і дапамогі людзям.

Што датычыць самога канфлікту. Мы ня мусім у ім удзельнічаць ні ў якой форме. Але мы павінны ведаць, што ***ў нашых беларускіх інтарэсах, каб Амэрыка як найхутчэй пераможна закончыла вайну***. У гэтым сэнсе нам трэба прызнаць рацыю амэрыканскага боку, зразумець амэрыканскае бачаньне будучыні ў інтарэсах ня толькі Амэрыкі, але і ўсяго цывілізаванага сьвету. У тым ліку — і незалежнага Іраку.

Пазыцыя немцаў і расейцаў — галоўных ворагаў нашай беларускай незалежнасьці — тут вядомая. Але зьвернем увагу на выказваньні цяперашніх расейскіх думальнікаў і палітыкаў. Яны кажуць, што ў іхных расейскіх інтарэсах — паражэньне і кампрамэтацыя Амэрыкі. І тлумачаць, што параза ў вайне, аслабленьне і зьніжэньне ўплыву Амэрыкі павялічыла б сусьветную цану на нафту (якая ўжо некалькі гадоў і так высокая). Гэта дало б Расеі (якая прадае нафту і газ) велізарныя барышы, якія можна было б часткова накіраваць на дадушэньне Чачэніі і захоп Беларусі, ды прыціснуць Украіну, і ўплываць на палітычныя стасункі ў Эўропе, закончыць яе перадзел на сфэры ўплыву і паставіць нагу на Блізкім Усходзе. Такую выснову можна зрабіць з выказваньняў некаторых рускіх аналітыкаў.

Пры ўсіх недахопах, „русацяпстве” і супярэчнасьцях амэрыканскай палітыкі, не забывайма, што Амэрыка ёсьць, практычна, адзіным гарантам (бо куды Амэрыка — туды й Вялікабрытанія) нашай беларускай незалежнасьці, яна схільная рэальна дапамагчы беларусам, была б толькі на гэта беларуская воля і беларуская сіла.

Мяркую, кожны разумее, што калі скончыцца агрэсіўная дыктатура Хусэйна і амэрыканцы прыстойна пераможуць, то рэжым прамаскоўскай сатрапіі на Беларусі адчуе сябе няўтульна, а расейскія шавіністы ў Маскве паўстрымаюць свой агрэсіўны імпэт. Гэта дасьць шансы беларусам хутчэй скончыць з сатрапіяй, абараніць незалежнасьць і па-людзку загаспадараваць сваю Бацькаўшчыну, спрыяльна для ўсіх людзей.

* * *

Тут мушу яшчэ парушыць вельмі істотны для нас, беларусаў, сьветапоглядны і псіхалягічны аспэкт, паколькі нашае цяперашняе грамадзтва сілком спынілі ў паняцьцях савецкай сістэмы. Савецкая ідэалёгія ўлады трымалася на вайне. У 1920-1930-х гадах — на псіхозе „дзейнасьці” зьнешніх і ўнутраных „ворагаў” і варожых падкопаў

буржуазных імпэрыялістаў, гатовых шкодзіць і напасьці на СССР. Пасьля вайны гэтая палітыка будавалася на гіпертрафіраванай, аднабокай і перакручанай памяці пра жахі вайны, якія ўзводзіліся ў паралізуючы пачварны культ сістэмнай ідэалёгіі страху перад вайной.

Амаль 50 гадоў савецкая сістэма выкарыстоўвала цярпеньні і пакуты людзей за часы Другой Сусьветнай вайны дзеля апраўданьня ўсіх сваіх недахопаў, рэпрэсіяў, эксплуатацыі і паразітызму, уціску і няўдачаў. Ідэалёгія канцэнтравалася ў формуле: *„галоўнае, каб не было вайны”*. Альтэрнатывай каляніяльнаму саветызму і сацыялізму выстаўлялася вайна. Таму трэба было цярпець, і з усёй мярзотай пагаджацца, „абы вайны не было”.

На гэтым ідэёва-псіхалягічным збачэнстве і страху запалоханых людзей 46 гадоў трымаўся Савецкі саюз, і гэтая прапаганда, гэты бяздумны жах перад вайной увайшлі у жылы і кроў савецкага чалавека.

Але элемэнтарны здаровы сэнс падказвае, што ***трэба баяцца не вайны, а рабства***; што ёсьць каштоўнасьці і зьявы, даражэйшыя за жыцьцё. І гэта даказваецца ўсёй духоўнай і экзыстэнцыяльнай гісторыяй чалавецтва.

Войны бываюць розныя. Мала хто здолеў дасягнуць незалежнасьці і свабоды без пакутаў, ахвяраў, барацьбы і вайны (хоць кожны хацеў бы мірнага самавызначэньня). І нікому не ўдалося засьцерагчыся ад агрэсіі, не супраціўляючыся.

Пагроза нашай незалежнасьці — гэта палітычная рэчаіснасьць цяперашняга часу. І як бы ні разьвіваўся маскоўскі акупацыйны сцэнар на Беларусі, рашаючае слова застанецца за беларусамі. Як, якім чынам яно будзе сказана, ці па сістэме „абы вайны не было”, ці на ўзроўні — „акупанты, прэч!”, ці ў пераканаваньні: „Бацькаўшчына — альбо сьмерць!” — ад гэтага ў канцовым выпадку будзе залежыць і наша будучыня.

*29 сакавіка 2003 г., Варшава* ***Зянон ПАЗЬНЯК***

# ЗЬНЯВАГА

*Друкуючы інфармацыю Алены Панкратавай, узятую зь нямецкага друку, якая прагучэла па радыё, лічым неабходным сказаць самае істотнае.*

*Беларускае грамадзтва мусіць зразумець, што найвялікшай каштоўнасьцю нацыі ёсьць сам чалавек, а ў Беларусі найперш — беларускія жанчыны, як найвыдатнейшы чыньнік жыцьцядзейнасьці беларускага народа. Такіх жанчынаў, як беларускія жанчыны, няма нідзе ў сьвеце. Нават расейскі камунізм ня здолеў зьнішчыць хрысьціянскі гонар і веліч беларускай жанчыны. Гэта, аднак, імкнецца рабіць і робіць цяпер бязбожны Захад, нямецкая духоўна дэградуючая Эўропа.*

*Трэба прыкласьці ўсе намаганьні, ужыць усіх спосабаў (у тым ліку, калі спатрэбіцца, самых радыкальных), каб запабегчы зьдзеку над беларускімі жанчынамі, прадухіліць маральна-чалавечыя страты нацыі.*

***Зянон Пазьняк***

Супрацоўнік нямецкай крымінальнай паліцыі *Манфрэд Паўлюс* ляцеў самалётам з Мюнхена ў Менск. Побач у салёне сядзеў уладальнік невялікай фірмы ў Паўдзённай Нямеччыне, які адкрыта дзяліўся сваім намерам знайсьці ў Беларусі прыгожых жанчын, юных, бедных і даступных. „Такіх у Беларусі шмат”, — сьцьвярджаў ён.

Адрасы, па якіх „прадпрымальнік” знойдзе неабходны „тавар”, ён меў.

Паводле спадара Паўлюса, кан’юнктура гэтага ценявога рынку ў Беларусі сёньня надзвычай высокая. Як сьведчыць паліцыянт, з кожным годам у сеткі гандляроў трапляюць усё больш дзяўчат. Часьцей — гэта правінцыялкі з Чарнобыльскай зоны. У выніку цяжкай эканамічнай сітуацыі ў Беларусі, яны бачаць толькі тры магчымыя шляхі: стаць жабрачкамі, зьвязацца з крыміналам альбо зьехаць як мага далей з Радзімы.

Спачатку дзяўчаты пакідаюць свае вёскі, зьязджаюць у сталіцу, абласны цэнтар. Там іх і знаходзяць шматлікія агенты злачыннай гандлёвай сеткі. Размовы, абяцаньні, расповяды пра агенцыі, якія ўладкоўваюць маладых дзяўчат, часьцей за ўсё, на працу нібыта ў польскія сем’і. 18-гадовая Валянціна купілася на нібыта штомесячны заробак у 200 даляраў і абяцаньні бясплатна жыць і харчавацца ў вялікім доме ля Варшавы.

Дзяўчыне не прышлося ні мыць посуд, ні даглядаць за дзецьмі. Супраць яе волі яе прывезьлі ў Франкфурт і здалі ўладальніку аднаго з бардэляў. Па дарозе ў Нямеччыну гандляры (трох мужчынаў) неаднаразова гвалцілі яе.

Паводле справаздачы Эўракамісіі, штогод нелегальным чынам у заходнюю Эўропу трапляюць больш за 700 тысячаў маладых жанчынаў з Усходняй Эўропы. Прыкладна 500 тысячаў зь іх прымусова займаюцца прастытуцыяй у танных заходніх бардэлях.

Лічацца, што гандаль беларускімі жанчынамі займае 3-4 пазыцыі ў гэтым крымінальным бізнэсе. „Калідор” на беларуска-польскай мяжы ў гэтым гандлі дзейнічае без праблемаў.

Паводле спадара Паўлюса, самай небясьпечнай прынадай для беларускіх жанчынаў ёсьць так званыя „шлюбныя агенцыі”. Маладыя жанчыны (апроч іншага) у гэтым выпадку трапляюць у моцную фінансавую залежнасьць. Кантракты складаюць так, што дзяўчаты мусяць сплочваць пасярэдніцкія шлюбныя паслугі непасрэдна на месцы шлюбу. У выніку — яны становяцца крымінальнай уласнасьцю сутэнёраў.

***(З радыё. А. Панкратава)***

# ПРОБЛІСКІ

*Ліставаньне людзей ёсьць гістарычная каштоўнасьць. Мы часта друкуем у бюлетэні лісты людзей пад рознымі рубрыкамі. Нядаўна я атрымаў ліст „Дзёньнік вартаўніка”. Піша **Ганна Матусевіч** з Койданава, якая (як можна здагадацца) працуе вартаўніком у школе, захапляецца чытаньнем рознай (г.зн. рознага кшталту) літаратуры, засяроджаная ў выніку чытаньня на Адаме Міцкевічу, на „космасе”, Рэрыхах, ёгах, кальвінскай веры, але найбольш на гістарычнай Літве — Бацькаўшчыне Літве-Беларусі.*

*Акрамя таго яна піша вершы, прыслала разам зь лістом іх цэлую нізку. Мы зьмяшчаем тут адзін верш, разам з вытрымкамі зь „Дзёньніка вартаўніка”.*

***Зянон Пазьняк***

* * *

Устань,
Асьвечаны Боскай воляй,
Норад!
Бо западлы твой дух.
Бы ў рэанімацыі,
Стаім над тваею пасьцеляй
Ноч і дзень
У працы бясконцай
Нашых душ.

* * *

***НЯДЗЕЛЯ, 26-27 СЬНЕЖНЯ 1999 г.***

— Начавала?

— Угу.

— Надта ж дрэнную работу ты сабе выбрала. Адна, як воўк. І не баісься?

— Ды ну!

Гэты дзядзька з мутнымі вачыма, што прыцёгся раніцай у школу, мо’ які сталяр, быў цёмны-цёмны і шэры-шэры, бы згаданы ім воўк. Але слова „воўк” ён вымаўляў зусім па-нашаму, зрэшты, як і ўсе словы. Пэўна, ад таго я адчула ў сваім сэрцы востры жаль да гэтага шэрага ваўка — майго Брата. Гэта я на ўласным горкім досьведзе ўведала, што ***Жаль ёсьць Найвышэйшае Каханьне***. А яму адкуль ведаць, што я з начных вартаў у школе выходжу прасьвечаная, як іншыя вернікі з царквы пасьля ўсяночнай.

***КАЛЯДЫ. ПОСНАЯ КУЦЬЦЯ.***

А ўдзень, на Каляды, я дзівілася на пухір, што раптоўна выскачыў на маім правым безыменным пальцы. Адкуль узяўся гэты вогненны пярсьцёнак? Хіба што прыпякла яго, прыткнуўшыся да гарачай батарэі ў перадкалядную ноч, якую мусіла начаваць на спрытнай цьвёрдай лаве замест сьцюдзёнай панскай раскладушкі?

...А Куцьцю мы сустракалі па-ліцьвінску, так, як рабілася гэта некалі ў Востраве. Усе драбніцы я выпытала ў маёй бабулі Зоні — адзінай вольнай ліцьвінкі на ўсю паднявольную Літву. У Сьвяты вечар уся сям'я зьбіралася за стол, дзе гатавалася мо' якіх сорак страваў. Мужчыны тым часам кроілі аплаткі ці то Каляду. Выразалі зь іх кругі і доўжынькія пасачкі, якія, абмакнуўшы у малаку, устаўлялі між кругамі. За нітачку — і падвешвалі над сталом. І вісела вось такое паганскае сонца ў хрысьціянскай хаце, як неўміручая душа нашага народу.

А назаўтра я, прышоўшы з вахты, выклала ўчарашнюю куцьцю на рэшата, абвязанае матузком. Такую куцьцю трэба есьці ўсім сямейнікам, каб не разыходзілася сям'я.

Ад дзядоў Матусевічаў з Сьверынава (гэта па маме) у мяне засталіся толькі рэчы. Штогод на Каляды бабчыным даматканым абрусам засьцілаю стол. І на бабчын ручнік з вышытымі чырвонымі ніткамі крыптонімамі АМ (Альфіна Матусевіч) кладу сена; на сена — посную куцьцю з панцаку. І дзякаваць Богу, што жывыя яшчэ мае бацькі, з чыйго гумна я магу ўзяць гэтае сена. А што важней: памяць ці рэчы, душа ці матэрыя — няхай кожны адкажа на гэтае пытаньне сам. Бо ўрэшце: колькі каму дадзена — столькі з таго й вымагаецца.

*Ганна МАТУСЕВІЧ*

# У ІХ НЯМА ПРАБЛЕМАЎ

У лістападзе ў Бэрліне прайшоў 4-ы кангрэс рускага друку, у якім прымала ўдзел чыноўная дэлегацыя ад рэжыму на Беларусі. Лукашэнкаўскі „міністар інфармацыі" Міхаіл Падгайны — дэлегат „кангрэсу"— падзяліўся сваімі меркаваньнямі з газэтай „Голас Радзімы" (выдаецца КГБ для замежжа). Ён сказаў: „Мне задавалі пытаньне наконт стану рускамоўнай прэсы ў Беларусі. Я адказаў: тут у нас няма праблемаў. Болей таго, паміж Беларусьсю і Расеяй існуюць двухбаковыя дамоўленасьці, якія здымаюць усе абмежаваньні па распаўсюджаньні беларускай прэсы ў Расеі, рускамоўнай — у Беларусі." *

„Так держать", лейтенант Подгайный! Брава. Беларусіфікацыя Расеі йдзе поўным ходам.

*Адам МІКША*

---

* Голас Радзімы, — 2002, 27 лістапада.

# СЛОВА ДА СХОДУ БЕЛАРУСКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ Ў МЕНСКУ*

*(Вытрымкі)*

Сход Беларускай інтэлігенцыі Меншчыны — гэта добрая падзея. Яна сьведчыць аб клопаце пра Беларусь.

Заклікаю рэальна глядзець на наша становішча і адпаведна дзейнічаць.

На Беларусі змагаюцца дзьве сілы. Адна — за незалежную Беларусь, супраць агрэсіі Расеі. Другая — за сумеснасьць з Расеяй.

У гэтым падзеле няма і ня можа быць ніякіх „трэціх", „чацьвёртых" ці „пятых" сілаў і ніякіх „нэўтральных". Таму што йдзе вайна. Вайна з Расеяй, вайна бяз зброі — за Беларусь.

Для Беларусі няма будучыні і няма незалежнасьці — разам з імпэрскай Расеяй.

На жаль, шмат якім беларусам не хапіла нават дзесяці гадоў, каб убачыць і зразумець, чым ёсьць і што нясе для Беларусі рускі імпэрыялізм.

Менавіта гэтае беларускае неўразуменьне дапамагло расейскім спэцслужбам ажыцьцявіць унутраную акупацыю ўлады на Беларусі і ўзяць яе пад свой кантроль. Менавіта гэтая адасобленасьць элітаў дазволіла акупантам на працягу дзевяці гадоў беспакарана рыхтаваць ліквідацыю незалежнасьці і здачу нашай краіны. Якраз гэтае беларускае ганебнае *неадчуваньне ворага* дазволіла расейцам летам мінулага года аб'явіць пра намер захапіць Беларусь, сказаць груба ў твар пра анэксію нашай краіны.

Трэба ведаць, што той, хто і цяпер нічога не ўсьвядоміў ды рашыў пастаяць у баку, — будзе зьнішчаны, ліквідаваны Масквой. Бо калі сказана нават ужо: „Іду на вы!"— брацца трэба толькі за меч.

***З усіх відаў чалавечай дзейнасьці найвышэйшай справай ёсьць палітыка.*** Нічога няма важнейшага, бо палітыка вызначае лёсы народаў.

Ідземце ў палітыку. Трэба йсьці — такі час. Бо палітыка ўжо сама ломіцца ў нашае жыцьцё. Мы мусім перарабіць яе з нашага ворага — у нашу зброю.

Прамаскоўскі рэжым хоча выкарыстаць падстаўныя выбары ў мясцовыя Саветы, каб потым правесьці рэфэрэндум аб зьмене ў Канстытуцыі. Каб юрыдычна забясьпечыць легальную ліквідацыю беларускіх грошай і ўвядзеньне рускіх, каб рукамі беларусаў легалізавацца і прадугледзець трэці прэзыдэнцкі тэрмін для Лукашэнкі. Гэта быў бы крок да анэксіі, да нашага нацыянальнага небыцьця.

Народ Беларусі адлучаны ад фармаваньня выбарнай улады, бо рэжым стварыў жорсткую сістэму фальсіфікацыі галасаваньня.

Удзел выбаршчыкаў у галасаваньні патрэбны рэжыму толькі як факт, які дае магчымасьць для фальсіфікацыі. Выбары ператвораныя рэжымам у прыладу для дасягненьня любых патрэбных яму палітычных мэтаў. Механізму ўплыву на гэтую сістэму — няма. Спыніць фальсіфікацыю — немагчыма. Дзейнічае крымінал і грубая сіла.

У гэтай сітуацыі ёсьць адзіны выхад — байкот. Нельга ісьці на ашуканскія выбары. Нельга забясьпечваць рэжыму прыход выбаршчыкаў на ўчасткі і магчымасьць „выйграць" чарговы рэфэрэндум у падтрымку чорнае справы, едучы на плячах беларусаў. Нельга ўдзельнічаць у здрадзе.

* * *

Ёсьць яшчэ адна тэма, менш вядомая, зь якой я хацеў бы зьвярнуцца да вас.

Мушу перасьцерагчы ад ілюзіяў, зьвязаных з Захадам. Не чакайма адтуль ні шчырай дапамогі, ні збаўленьня. Прагматычны інтэрас, перш за ўсё, рухае эгаістычнай іхняй палітыкай, што ператвараецца паступова ў міжнародны разбой. Ружовае славаблудзтва аб „правах чалавека" не перашкодзіць ім здаць на вынішчэньне і Чачэнію, і Беларусь, і іншыя народы, калі толькі падважыцца гэты іхны інтэрас. Яны ня спыняцца ні перад саюзам з крымінальнай Расеяй, ні са „скопішчам зла", ні з самым д'яблам.

Захад не аднародны, але на сёньняшні дзень — гэта грамадзтва духоўнага ўпадку, якое ня выратуе ўжо ні дэмакратыя, ні эканоміка, а толькі хіба — духоўнае Адраджэньне (калі яно ўзьнікне).

Мы ня мусім успрымаць і ацэньваць гэты Захад агулам, але шукаць там спрыяльныя сілы дабра, што таксама змагаюцца тут за будучыню, справядлівасьць і выжываньне.

Наша беларуская будучыня, нашае існаваньне і наша воля — у нас самых. Толькі тут, на Захадзе, у другой палове жыцьця я па-новаму зразумеў, які вялікі, які магутны Беларускі народ. Які вялікі Якуб Колас, які магутны Купала.

Мы, беларусы, сьціснуліся цяпер, як шагрэнева скура, але мы — ня Ўсход і ня Захад. Мы — асобная цывілізацыя, якая была некалі для нашых продкаў цэнтрам Сусьвету.

Шануйма ж, аберагайма сябе — наш вялікі Беларускі народ. Гэта ні нехта — там. Гэта мы — усюды.

Не давайма нягоднікам бэсьціць народ, зьневажаць яго дрэннымі словамі. Не ўпадайма ў адчай, не выказвайма прэтэнзіяў. Бо прэтэнзіі інтэлігенцыя можа прад'явіць толькі сама сабе.



*Асьвячэньне Сьцяга ў касьцёле на Пінщчыне.*

У час сьмяротнай небясьпекі для нацыі я адчуваю надыход сьветлага Адраджэньня Вялікай Беларусі. Можа, гэта здасца каму неабгрунтаваным, але я не магу не сказаць, што чую ў сваёй душы.

Слава Беларусі! Жыве Беларусь! Хай жа будуць гэтыя словы на нашых вуснах і ў нашых сэрцах.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Старшыня Беларускага***
***Народнага Фронту „Адраджэньне",***
***кіраўнік БКА***

*18 студзеня 2003 г.*
*Варшава-Менск*

---

* Ліст ня быў прачытаны на сходзе інтэлігенцыі Меншчыны па прычыне асьцярожнасьці. (рэд.)

# ЗАЦЕМКІ З ШВЭЦЫІ

Гісторык ***Андрэй Катлярчук*** — беларус з Расеі. Ён вядомы навуковай грамадзкасьці ў Беларусі (працаваў як дасьледчык у галіне беларуска-расейскіх стасункаў, вучыўся ў асьпірантуры ў Санкт-Пецярбургу).

У апошнія гады стаў дасьледваць малавядомыя старонкі беларускай гісторыі (дзе ён, фактычна, першаадкрывальнік).

Жыве ў Стакгольме. У Швэцыі працуе як дасьледчык (атрымаў грант) Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). У новым Стакгольмскім унівэрсітэце, які мяркуецца зрабіць цэнтрам навуковых дасьледваньняў балтыйскіх абшараў, будуць улучаны навукоўцы і студэнты з балтыйскіх краінаў.

У 2000 годзе швэдзкі інстытут прыняў рашэньне: Беларусь лічыць краінай Балтыйскага абшару. Гэта значыць — у дзейнасьці швэцкіх навуковых установаў праекты зь Беларусі (разам з краінамі Балтыкі) маюць перавагу. Ёсьць стыпэндыі для беларускіх навукоўцаў.

Тут ёсьць катэдры эстонскай мовы і гісторыі, шмат спэцыялістаў. Беларуская мова, на жаль, не вывучаецца ва унівэрсітэтах. Але ёсьць дасьледчыца Беларусі і напісала кнігу пра гісторыю Беларусі.

Падрыхтаваную Андрэем Катлярчуком кнігу (пра ВКЛ) швэдзкі інстытут будзе друкаваць па-беларуску.

У Швэцыі нешта робіцца сёньня дзеля азнаямленьня зь беларускай культурай: выйшаў зборнік твораў васьмі сучасных беларускіх паэтаў, *„Кар'ер"* Васіля Быкава.

Робіцца таму, што ёсьць Беларуская дзяржава, ёсьць дзяржаўная краіна. Калі ёсьць дзяржаўная краіна, то адбываецца і яе вывучэньне.

Калі параўнаць, напрыклад, Беларусь і Татарстан, то Татарстан — гэта таксама моцная культура з моцнымі гістарычнымі карэньнямі, дзе ёсьць павага да татарскай мовы. Але ім, татарам, вельмі цяжка прабіцца на міжнародны навуковы рынак, бо няма дзяржавы.

Няма дзяржавы — няма дзяржаўнай зацікаўленасьці ў сьвеце.

***(Паводле радыё „Свабода")***

# ВІЦЕБСКАЯ РЭЧАІСНАСЬЦЬ

На працягу апошніх трох месяцаў *сябра Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ спадар **Уладзімер Плешчанка*** выходзіць у цэнтар Віцебска з плякатам *„Збор сродкаў супраць расейскай агрэсіі"*, каб давесьці да жыхароў горада праўдзівую інфармацыю пра антыбеларускую палітыку Расеі. Да яго рэгулярна далучаліся сябры спадары ***Аляксандар Салаўян*** і ***Барыс Хамайда***. 20 студзеня ўсіх траіх дэманстрантаў затрымала міліцыя і склала пратакол.

6 лютага адбыўся суд над *спадаром Уладзімерам Плешчанкам*. Суддзя Чыгуначнага раённага суда г. Віцебска **С**. **Туфан** прысудзіла У. Плешчанку штраф ў памерах 150 мінімальных заробкаў – 1 850 тысячаў рублёў за „арганізацыю несанкцыянаванага пікета". Спадар Плешчанка заявіў, што ня будзе плаціць незаконна накладзены штраф і будзе працягваць збор сродкаў супраць расейскай агрэсіі.

Цікавая ўвогуле зьява ў Віцебску. Клясычная параноя (нездарма рэжым паранойны). Спадар Плешчанка, практычна, беспрацоўны чалавек. Ніякай працы яму не даюць з-за ягоных беларускіх перакананьняў, ды і маёмасьці ў яго, фактычна, ніякой няма. А вось жа адзін за адным „кляпаюць" яму штрафы па тысячы даляраў (хутка стане „мільянэрам") толькі за тое, што чалавек пастаяў з плякатам.

Тут ужо калі прыйдзе час, проста быць ня можа, каб забыліся пра гэтую Туфан.

***(Інфа)***

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(паводле „Народнай Волі", „Нашай Свабоды" і радыё.)*

## *СТУДЗЕНЬ* (2002 г.; працяг з №1(47))

■ Больш, чым у Беларусі, курс даляра вырас толькі ва Узбэкістане. Па тэмпах росту афіцыйнага курсу даляра да нацыянальнай валюты летась Беларусь заняла другое месца сярод постсавецкіх краінаў. Ва Узбэкістане курс падскочыў у **2,1** разы, у Беларусі – на **33,9%**, у Таджыкістане – **15,9%**, у Расеі – на **9%**.

■ Яшчэ ў 1995 г. быў сьцьверджаны парадак спрошчанага афармленьня дакумантаў для мігрантаў, якія прыязджалі ў атручаныя Чарнобылем раёны Беларусі. Улады імкнуліся паўторна засяліць гэтыя тэрыторыі перасяленцамі з Расеі, Казахстану, Сярэдняй Азіі, Каўказу. Цяпер брагінскія міліцыянты ледзь даюць рады, змагаючыся са злачыннасьцю. Яны лічаць, што *наркаманію ў раён завезьлі азіяцкія мігранты*. Павялічыліся ў чарнобыльскіх раёнах крадзяжы, махлярства, забойствы і калецтвы на бытавой глебе.

22 студзеня ў Маскве на прэс-канфэрэнцыі выступіў наконт „інтэграцыі" сумнавядомы Канстанцін Затулін, дэпутат думы і дырэктар Інстытуту краінаў СНД (ёсьць і такі). Затулін лічыць, што трэба хутчэй правесьці выбары ў „саюзны" парлямант Беларусі і РФ. Такі парлямант „адновіць фэномэн агульнай палітычнай прасторы з Беларусяй, уцягне палітычныя сілы Расеі і Беларусі ў зацікаўлены дыялёг" (вось вам яшчэ адзін дыялёг). Нельга, аднак, не пагадзіцца з Затуліным, што ў выпадку разьвіцьця такога дыялёгу праз некаторы час „выявіцца, што ў Беларусі ёсьць і больш выдатныя інтэгратары, чым Лукашэнка" (ёсьць, сп. Затулін, ёсьць! Ужо даўно выявіліся).

Далей маскоўскі стратэг зрабіў цікавае адкрыцьцё ваеннай тайны ў стылі „Цімура і яго каманды": калі не зрабіць тэрміновых захадаў, каб надаць незваротнасьць працэсу аб'яднаньня, то „можа аказацца, што ахвяры, якія мы нясем для аб'яднаньня, фінансавыя, эканамічныя, ня будуць апраўданыя, у тым ліку стаўка на газаправод праз Беларусь і Польшчу".

■ За апошнія 5 гадоў больш за **400** беларускіх навукоўцаў пакінулі радзіму. Зь іх **60** дактароў навук і каля **200** кандыдатаў. У прапорцыі да колькасьці насельніцтва *такі зыход навуковай эліты можна параўнаць толькі з уцёкамі нямецкіх навукоўцаў ад гітлерскага рэжыму ў 1930-я гады.*

■ Па стане на 21 студзеня запазычанасьць бюджэту перад настаўнікамі перавысіла **17** мільярдаў рублёў. У параўнаньні з пачаткам 2002 г. запазычанасьць узрасла ў **10,5** разоў. Затое ў леташнім сьнежні было абвешчана пра падвышэньне заробкаў настаўнікаў. Аднак **70%** настаўнікаў дагэтуль не атрымалі заробку.

■ У цэлым у 2001 г. спажывецкія цэны выраслі на **46%**. Платныя паслугі — на **78,1%**, цэны на паслугі дзіцячых дашкольных установаў у **3,62** разы, праезд у гарадзкім пасажырскім транспарце у **2,02** разы, у прыгарадным — у **2** разы. Паслугі адукацыі выраслі на **94,1%**, аховы здароўя — на **70,8%**, сувязі — на **58,1%**. Харчовыя тавары падаражэлі за год на **46,5%**. У „лідэрах" бульба (у **2,35** разы) і малочныя прадукты (на **78,2%**). Крыху ніжэйшым аказалася павелічэньне цэнаў прамысловай прадукцыі – „усяго" на **39,4%**, кошту будаўніча-мантажных работаў на **30,6%** і тарыфаў на грузавыя перавозкі — на **45,2%**.

## *ЛЮТЫ (2002 г.)*

### *(паводле „Народнай Волі", „Нашай Свабоды" і радыё )*

■ Прызначаючы на прыканцы мінулага году цяперашняга міністра аховы здароўя **Уладзіслава Астапенку**, Лукашэнка даручыў таму, каб 30% медычных паслугаў сталі бліжэйшым часам платнымі. Народ, аднак, даўно вынайшаў афарызм – мэдыцына ў нас бясплатная, а вось лекарам трэба плаціць.

І міністэрства пачало рэагаваць. 31 сакавіка *будуць скарочаныя чатыры (!) ўчастковыя бальніцы на Шчучыншчыне* ( там, відаць, усе раптам паздаравелі). Цяпер на 60 тысячаў насельніцтва раёну налічваецца 720 бальнічных месцаў (не самая горшая прапорцыя, у параўнаньні, скажам, з Экватарыяльнай Афрыкай). У сакавіку іх колькасьць зьменшаць на **110** ложкаў.

■ эфіцыт грошай на веснавую сяўбу ў поўным аб'ёме складае **259** мільярдаў рублёў, у тым ліку на Берасьцейшчыне – **40** млрд., Віцебшчыне – **55** млрд., Гомельшчыне – **42** млрд., Горадзеншчыне – **33** млрд., Магілеўшчыне – **41** млрд. Пра гэта паведамілі 29 студзеня на паседжаньні Прэзыдыюму савету міністраў краіны ў Менску.

Раней калгасы ў нас былі мільянэрамі, цяпер пераўтварыліся ў міліярдэраў...

■ З прапановай абмежаваць з 1 красавіка сёлета колькасьць міжнародных рэйсаў для шэрагу марак самалётаў, у тым ліку машынаў расейскай вытворчасьці ТУ-134, ТУ-154, АН-24 і ЯК-40, выступілі краіны Эўразьвязу ў лістападзе летась. Узровень шуму і экалагічныя паказчыкі гэтых самалётаў не адпавядаюць міжнародным стандартам. Беларускі авіяцыйны парк амаль на 100% укамплектаваны менавіта самалётамі расейскай вытворчасьці, і да таго ж ён не абнаўляўся больш за 10 гадоў. Так што, прыехалі...

■ Па выніках 2001 г. **35,5%** прамысловых прадпрыемстваў Беларусі аказаліся стратнымі. Пра гэта 24 студзеня паведаміў журналістам старшыня некалі ганчарыкаўскай Фэдэрацыі прафсаюзаў Франц Вітко. Ён накрэсьліў выразную „эвалюцыю" працэсу развалу вытворчасьці ў краіне: у 1998 г. стратных прадпрыемстваў было 16,25%, у 1999 г. – 17,1%, у 2000 – 23,4%.

■ Пасьля па-праметэйску гераічнага закліка свайго старшыні **А. Лябедзкі** да дыялёгу „во імя блага народа", наваполацкая арганізацыя АГП пайшла ў наступ на мясцовыя ўлады „за народнае блага" (пра гэта шумна і сэнсацыйна паведамляла Радыё *Свабода*). На заклік правесьці дыялёг мясцовага значэньня па праблемах сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця гораду і краіны (памятаеце? – Urbi et Orbi) наваполацкі гарвыканкам адказаў, што прапанаваныя тэмы „не адпавядаюць узроўню гарвыканкаму".

А шкада! Разгарнуліся б круглыя сталы, па дзесяць асобаў з кожнага боку, а там і ўся краіна счапілася б у лякальных дыялёгах...

■ У дысыдэнцкіх колах абрэвіятуру Беларускага Гэльсінскага камітэту (БХК, па-расейску) ужо даўно не вымаўляюць інакш, як „ха-ха-ха". Маленькай ілюстрацыяй працэсу стала перарэгістрацыя сяброў арганізацыі ў Крычаве на прыканцы студзеня. З сямі крычаўскіх прадстаўнікоў толькі двое пацьвердзілі свой удзел у БГК. Прычынай адмовы астатніх ад супрацоўніцтва стала падзеньне даверу як да паасобных кіраўнікоў, так і да ўсёй арганізацыі.

■ Кэгэбісцкая крэатура пад назовам „Зубр" перакваліфікоўваецца. Пра гэта было заяўлена 6 лютага на прэс-канфэрэнцыі ў Менску, дзе вядомыя маладзёвыя „інтэлектуалы" **Цімох Дранчук** ды **Андрэй Пятроў** распавядалі пра „новую стратэгію і тактыку арганізацыі". Зубры, аказваецца, „пераходзяць на некаторы час ад палітычнай тэматыкі да сацыяльнай". У шэрагу сталічных пад'ездаў цягам мінулага месяца юныя героі расклейвалі аб'явы з нумарамі тэлефонаў мясцовых ЖЭС. Гэта на выпадак працяканьня даху ці яшчэ чаго. Цяпер „новацімураўцы" такім чынам змагаюцца пад дэвізамі „Так жыць нельга!" ды „Будзем разам і Беларусь стане чыстай!" Калі ўспомніць, як па Маскве зусім нядаўна маршыравалі маладзёны з венікамі ў руках ды крычалі „Поможем Путину сделать страну чистой!", то стане ясна, зь якой бочкі зачэрпнута гэтая „стратэгія".

■ 300 вызваленых работнікаў прафсаюзу аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудаваньня зьбіраюцца падаць у суд на А. Лукашэнку аб абароне сваіх гонару і годнасьці. Пра гэта паведаміў 9 лютага старшыня прафсаюзу Аляксандр Бухвостаў.

Але ж волаты, абаронцы рабочага класу! Само просіцца параўнаньне з 300 спартанцамі, што баранілі радзіму ад персаў. Толькі ж элінскія героі не падавалі на дэспата Дарыя ў суд, а змаганьнем давалі прыклад астатнім грэкам. Да таго ж прэса нешта не паведаміла пазьней, ці дайшлі прафсаюзныя генэралы да прыёмнай суда, ці абмежаваліся пужаньнем.

■ Рост валавога ўнутранага прадукту Беларусі ў 2001 г. аказаўся самым нізкім сярод краінаў СНД. Ён склаў **4,1%**. У Казахстане рост ВУП – **13,2%**, у Таджыкістане – **10,2%**, Азэрбайджане – **9,9%**, Арменіі – **9,6%**, Украіне – **9%**.

■ У 2002 г. рэальнае фінансаваньне фундамэнтальнай навукі паменшыцца. Пра гэта паведаміў чыноўнік Нацыянальнай Акадэміі навук Ю. Курачкін. Колькасьць праграмаў фундамэнтальных дасьледваньняў зменшылі з **52** да **44**.

■ Даўно „цывілізаваны сьвет" не ўспамінаў пра Чарнобыль. І вось успомніў. Нядаўна ў Нью-Ёрку адбылася прэзэнтацыя справаздачы ААН *„Наступствы атамнай аварыі на Чарнобыльскай АЭС для жыцьця людзей – стратэгія аднаўленьня".*

Што ж зьбіраюцца аднаўляць нашыя дабрадзеі? Японец Ашыма казаў пра працэс зьмены падыходу да аказаньня дапамогі ў рашэньні чарнобыльскіх праблемаў. У аснове ўказанага падыходу ляжыць „прыярытэтная ўвага пытаньням разьвіцьця тэрыторыяў, што пацярпелі". Ашыма працягвае: „Мэта новай стратэгіі ў тым, каб забясьпечыць накіраваньне рэсурсаў тым, хто мае найбольшую патрэбу. Такім чынам будуць ствараюцца ўмовы і магчымасьці для пераходу ***большасьці насельніцтва да самазабесьпячэньня***". Раней дабрадзеі з розных

атамных камітэтаў разважалі пра „бясьпеку пражываньня на чарнобыльскіх тэрыторыях пры ўмове забесьпячэньня насельніцтва чыстымі прадуктамі харчаваньня”. Цяпер есьці атруту зрабілася няшкодным. А асьпіранты прафэсара **Ашымы** будуць прыязджаць ды ў рэсьпіратарах зьбіраць на беларускіх чарнобыльцах матар’ялы для дысэртацыяў. У справаздачы ААН сфармулявана больш за 20 канцэпцыяў праектаў, „зьвязаных з аднаўленьнем і разьвіцьцём пацярпелых тэрыторыяў” (пра пацярпелых людзей у прэамбулах нияк не згадваецца).

Выказвалася і выканаўчы дырэктар Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) **Кэрал Бэламі**. Можа яна сказала нешта пра неабходнасьць высяленьня дзетак з атручаных земляў? Учытаемся ў цытату з ейнай прамовы: „Неабходны паступовы пераход ад прыярытэтнага прадастаўленьня ільготаў да інвэставаньня сродкаў у базавую ахову здароўя, эканамічнае разьвіцьцё *(гэта дзе? – там, дзе нельга жыць!)* ды ***ў паляпшэньне стану навакольнага асяроддзя***”.

Цяжка паверыць, што пані Бэламі прыедзе паляпшаць стан атамнага сьметніка са сваёй сям’ёй у якія-небудзь Хвойнікі. А мы, наіўныя, думалі, што заявы Лукашэнкі ў чарнобыльскіх раёнах накшталт „тут жыць можна і трэба” былі плёнам хворай фантазіі. Гэта, аказваецца, міжнародны атамны бонтон. Хаця, калі дарослае насельніцтва Зоны актыўна сьпіваецца, галасуе за калхозны фашызм ды не бароніць сваіх дзяцей, якім можа быць вынік праз 17 год пасьля трагедыі?

■ Пры канцы студзеня група беларускіх студэнтаў езьдзіла на фэстываль у Санкт-Пецярбург. У горадзе „вялікага Леніна” паўсюль грымелі блатныя песьні крымінальніцкага стылю: у аўтобусах, рэстаранах, гатэлях, на вуліцы. На самым фэстывалі расейскія танцгрупы выглядалі хутчэй як танцбанды і танцзондэрнкаманды. Усіх уразіла праграма групы „Неўскі праспэкт”, прысьвечаная катастрофе падлодкі „Курск”, з шумам прыбою і імітацыяй заліваньня вадой адсекаў (!). Потым каля 20 дзяўчатак-падлеткаў пачалі скакаць пад дзікую змрочнага мэласу музыку. Адзін іхны гурт „страляў” у другі, і паненкі карцінна валіліся адна за адной на сцэну. Апранутыя яны былі ў стылізаваныя вайсковыя строі, твары запэцканыя пад спэцназаўскі бруд.

Нацярпеўшыся ад ленінградзкага мілітарызму, беларусы думалі адпачыць у купэ вагона, што вяртаў іх у Менск. Але ж там прысуседзіўся маладзенькі афіцэр, якога забралі служыць у Чачэнію. Ён не танцаваў, увесь час піў гарэлку і плакаў. Наракаў, што няскора, а можа ніколі не пабачыць сваю дзяўчыну і родны горад.

***Валеры БУЙВАЛ***

# POLICE REPRESSIONS IN MINSK AT THE INDEPENDENCE DAY

On March 23, 2003 hundreds of persons came to the Independence Sq. in the center of Minsk to celebrate the 85$^{th}$ anniversary of the independent Belarusan People’s Republic (proclaimed on March 25, 1918 and occupied by the Russian communist army the same year). The anti-Belarusan regime has surrounded the Independence Sq. by the heavy police and KGB forces. Several persons have been arrested before the rally. At 12.20 p.m. the riot police has attacked the peaceful rally on the Skaryna Avenue. The people marched under the national white-red-white flags and sang the national religious anthem Almighty God. The police officers beat the people with batons and legs. More than 50 persons have been arrested. More than 20 members of the Conservative Christian Party – BPF have been arrested this day (among them Mr. Siarhei Papkou, the deputy chairman of our Party). The arrested persons have been moved to the police stations and subjected to the humiliating procedure: photographed and taken their finger prints – like the criminals. Three of our Party members have been imprisoned in the special detention center on the Akrestina St.: Mr. Uladzimier Yukho, Mr. Aleg Sahadzin, Mr. Anatol Rabkavets. On March 24 at 11.00 a.m. the arrested persons will be brought to trial at the Leninski regional court (Lenina St., 18). The pro-




***Беларусы ў Нью-Ёрку***

Moscow Lukashenka regime has demonstrated its hate to the Belarusan independence. The anti-Belarusan regime is afraid of the Belarusan people.

*March 23, 2003* ***(Press-service of the Conservative Christian Party – BPF)***
*(Пераклаў зь беларускай мовы на ангельскую В. БУЙВАЛ)*

# JUDICIAL REPRISAL AFTER THE INDEPENDENCE DAY

On March 24 the participants of the rally at the Independence Day (which had taken place in Minsk on March 23 in honour of the 85$^{th}$ anniversary of the independent Belarusan Popular Republic proclaimed in 1918 and occupied by the Russian communist army the same year) have been sentenced at the illegal processes at the Leninski regional court in Minsk. Like always the police officers were used as „the witnesses”. They gave the contradictories testimonies in accordance with the falsified police minutes. The judges violated the procedure and the laws executing the orders of the authorities. But we have noticed some new characteristics of their activity and tactics. Until recently the patriots have been sentenced after the protest actions because „they had made obstacles to the traffic on the streets, resisted the police etc.”. The authorities tried to avoid the political argumentation. Now they have used the following main accusations: „he (or she) shouted the slogan „Long Live Belarus!” and had a white-red-white flag”. At first sight this is a formal change of the accusations. But these accusations wetness the cynical, openly anti-Belarusan and anti-state activity by the authorities which are obliged to defend the Belarusan citizens and the Belarusan state. The pro-Russian regime doesn’t hide more its anti-state criminal act. The Belarusan citizens have been sentenced because they had committed „the criminal acts”: they have expressed their devotion to the Fatherland and the ancient historical national Belarusan White-Red-White flag. The regime has demonstrated that it is an instrument of the Russian imperialist aggression against our people and our state. But this regime is afraid of the responsibility. The palace of justice was crammed by the police forces. Several times the police tried to force out the people which came to support the patriots (the processes were formally public). Then the police has forbidden to enter the palace of justice. Following

members of the Conservative Christian Party – BPF have been sentenced this day: Mr. Mikalay Stotik (the fine of 20 minimal salaries – 135 US dollars), Mrs. Natalia Vasilevich and Mr. Aleg Sagadzin – they have been beaten by the riot police (the warning), Mr. Anatol Rabkavets (the fine of 30 minimal salaries), Mr. Uladzimier Yukho (7 days in jail), the deputy chairman of our Party and Popular Front Mr. Siarhei Papkou (the fine of 20 minimal salaries). The local colonial pro-Russian administration hates everything what is Belarusan and is suppressing the Belarusan people. This is a very alarming signal to our people. The Belarusan Solidarity on the ground of our national interests and the united resistance are our methods of defence against the Russian aggression which is annihilating Belarus. Hundreds of persons marched in the center of Minsk at the Independence Day in spite of the repressions by the anti-Belarusan regime. This fact witnesses the optimism of our people. Long Live Belarus!

*March 24, 2003* ***(Information commission of the Conservative Christian Party – BPF)***

*(Пераклаў зь беларускай мовы на ангельскую В. Буйвал)*

# ELECTORAL FRAUDS

The Belarusan society is well informed about and has a big experience of the special system of the electoral frauds used by the pro-Moscow regime in Belarus. This system is not controlled by the society. The special trained persons have been chosen to operate this system. The Lukashenka regime has excluded the Belarusan people from the formation of the representative power using namely this occupation system of the falsification.




***Фронтаўцы на Случчыне***

These facts have confirmed several times that the elections in Belarus cannot be free and democratic under the pro-Moscow regime. It is impossible to elect the deputies which represent the opposite position to the regime. The regime has the opportunity to launch every kind of the political adventure during the elections or the referendum using the system of the electoral frauds. The pro-Moscow authorities of Belarus are completely ignoring the opinion of the Belarusan people (they are sure that the people will tolerate every injustice and mockery) as well as the international public opinion.

On March 2, 2003 ***only one third of the electors came to the polling stations of their own free will*** during the elections to the local soviets (councils). The major part of these persons has yet confidence in the promises of the regime as well as the persons which believed the appeals by the pseudo-opposition. They have participated in the elections contrary to the logic and the demands by the Belarusan Liberation Movement. Many persons have been intimidated by the administration and forced (even moved) to the polling stations.

Other ***two thirds of the electors didn’t take part in the elections.*** Their „participation” and „voting” has been falsified by the system of the electoral frauds. For example not more than **35%** of the electors have voted in Minsk. The regime has reported the **60%.**

The numerical data announced by the regime represent the results of the total manipulations by the state authorities. During the electoral farce (on the eve as well at the day of the voting) the citizens of Belarus have experienced a relentless pressure by the authorities. The administration forced the people to vote in order to fraud the results of the elections. In fact the electoral commissions acted as the political bodies of the power. The major part of them didn’t allow the public control of their activity.

In the first place the inhabitants of the villages and the towns have been pressed by the administration as well as the employees of the plants and offices, students of the state high schools and the parents of the students. The citizens have been threatened to be fired, expulsed from the campus and from the high school. All these facts will be generalized and published.

The electoral commissions (forced by the authorities) have committed all these total and cynical violations of the electoral laws. There are three main aspects of the electoral criminal act:

- the falsification of the voting;
- the preparation of the staff of the electoral commissions in order to commit the frauds;
- the involvement of the members of the electoral commissions into the common criminal act in order to launch the falsification of the planned „referendum” on the illegal „constitutional act” of the annexation of Belarus by Russia (Lukashenka and Putin will formulate its text at the necessary time).

„The deputies” have been included illegally into the local soviets as a result of the electoral frauds. They have to know that they will be used by the regime in its illegal activity in the future. In fact they became the hostages of the regime.

The Belarusan Popular Front and its Conservative Christian Party – BPF (as the main parts of the Belarusan Liberation Movement) declare that ***the local elections on March 2, 2003 have been falsified and cannot be recognized as legal.***

All the electoral commissions which participated in the electoral frauds have committed the criminal act and violated the laws. They have to be excluded from the electoral process and cannot participate in the electoral campaigns in the future. The violations of the electoral laws by the members of the electoral commissions have to be examined at the court.

We stress that only the mass boycott of the electoral profanations by the whole population can secure the victory of the people over the usurpers of the power in Belarus in these circumstances.

There is a peaceful perspective for Belarus – there are the new presidential elections under the international protectorate (i.e. under the broad international control by the United Nations on all the stages of the electoral campaign and with the participation of the international observers during the poll).

We appeal the society to by attentive and to resist every electoral adventure by the anti-Belarusan regime, and not to allow to the regime to launch the next illegal referendum.

***The leadership of the Belarusan Popular Front „Adradzennie” and of the Conservative Christian Party — BPF***

*Minsk, March 14, 2003*

*(Пераклаў зь беларускай мовы на ангельскую Валеры Буйвал)*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**